ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 96 (4348)
ПЯТНІЦА, 29 красавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Змагацца за поўнае і сваячасовае выкананьне пляну самазагатовак.
Рабочую сілу—тарфяным палём (1 стар.).
СТАЛЕВІЧ, КАНАКОЦІН—Да пытаньня аб беларускай мове (2 стар.).
АГЛЯД ДРУКУ—«За «Інтэрнацыянал» і «Універсалку» (3 стар.).
За якасьць, высокі ўраджай, скарочаныя тэрміны сяўбы (1 стар.).
Забясьпечыць баявое разгортваньне дарожнага будаўніцтва (з выступленьня сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гінало на ўсебеларускай нарадзе па дарожным будаўніцтве (2 стр.).
Бальшавіцкімі тэмпамі разгарнуць сяўбу ў прыгарадных гаспадарках (2 стар.).
СПРАВАЗДАЧА НАРКАМПРАЦЫ СССР (з дакладу тав. Ціхона)—2 стр.
Дзкрыцьцё зьезду саветаў Койданаўшчыны (3 стар.).
КАМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА—Мабілізацыяй унутраных рэсурсаў пакрыць недахват у матар'ялах (3 стар.).
Фашысцкая Польшча напярэдадні фінансавай катастрофы (4 стар.).
ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б—Аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва, дзяржаўных даходаў з аграмаднанага сэктару і тавараабароту ў першым квартале 1932 году (4 стар.).

ЗМАГАЦЦА ЗА ПОЎНАЕ І СВАЯЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ МЯСАЗАГАТОВАК

Партыя пастаніла пытаньні рабочага спабжэньня ў разрад першачарговых і баявых задач. У адпаведнасьці в гэтым і справа заготовак харчовых прадуктаў і, у прыватнасьці, загатоўкі жывёлы набываюць выключна важнае значэньне.

ЦК КП(б)Б ня раз з усёй сілай гэта падкрэсьліваў, не адзін раз паказваў на неабходнасьць бальшавіцкага выкананьня пляну мясазагатовак.

На прыкладзе работы перадавых раёнаў (**Дрыса, Сураж**), якія дэтэрмінова выканалі плян першага кварталу, на прыкладзе дзесяткаў сельсаветаў, саўгасаў і перадавых калгасаў даказана поўная магчымасьць у тэрміны рэалізаваць баявое заданьне партыі і ўраду.

Посьпех залежыць ад таго, наколькі мясцовыя партыйныя, савецкія арганізацыі **мабілізуюць масы** калгасьнікаў і адпаасобнікаў — бедняцкіх і серадняцкіх на выкананьне **сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.**

Крывая выкананьня пляну знаходзіцца ў **простай залежнасьці ад ступені барацьбы ў раёне, сельсавеце, калгасе, саўгасе з апартуністычнай недаацэнкай важнасьці мясазагатовак, з разбазараньнем мясной таварнай прадукцыі.**

Лічбовыя даныя і матар'ялы з месц паказваюць, што гэтыя здрадаласі-б, азбучна відомыя і разам з тым важнейшыя ўмовы пасьпяховасьці работы палёка ня ўсюды захоўваюцца. Цэлы рад кіруючых раённых і ў першую чаргу партыйных арганізацый усё яшчэ стаяць мясазагатоўкі па апошні плян, ня ўмеюць спалучыць пасеўныя работы з разгортваньнем загатовак жывёлы, а ў радзе месц апартуністычна недаацэньваюць і нават ігнаруюць гэту важнейшую справу.

Яркай ілюстрацыяй такога становішча мога служыць **Горацкі раён**, які даў 2,6 проц. квартальнага пляну, **Жыткавіцкі**—2,4 проц., **Гарадоцкі** — 8,3 проц., **Стара-Дарожскі**—2,7 проц., **Пухавіцкі**—2,7 проц., **Лоеўскі**—2,9 проц. і г. д. Квартальны плян па рэспубліцы выканан на 20 красавіка толькі на 9,4 проц.

Слабасьць работы ў гэтай галіне раду партыйных і асабліва загатоўчых арганізацый выкарыстоўвае кулак, распальваючы месьніцкія, рвацкія тэндэнцыі сярод адсталых груп калгасьнікаў. **На руку кулаку дзейнічаюць спэкуляцыйныя элементы,** якія яшчэ знаходзяць сабе прытулак у пасобных зьвяньнях мясцовага кааперацыйнага апарату.

За апошні час выяўлены цэлы рад фактаў злачынага разбазараньня мясной прадукцыі. Работнікі пасобных кааперацыйных арганізацый, груба скажаючы дырэктывы партыі аб мясазагатоўках, дэзарганізуюць загатоўкі, зрываюць забясьпячэньне рабочых мясам.

Чаго варта, напрыклад, дзеяньне работнікаў **мальыскіх** сталовак, якія закупілі 53 штукі кароў і мяса прадалі па высокіх цэнах месцачковым клерыкалам «на кошэр».

Падобнага роду «апэрацыі» праводзіць **Пухавіцкае** сельспажытаварыства, і інш. Самым агідным зьяўляецца тое, што падобныя гандлярскія махінацыі праводзяцца пад шыльдай барацьбы за паляпшэньне снабжэньня рабочых.

Што супольнага маюць гэтыя антысавецкія загатоўчыя, спэкуляцыйныя практыкаваньні з барацьбой за сапраўднае і няўхільнае паляпшэньне снабжэньня рабочых важнейшым прадуктам харчаваньня?

Горш за ўсё тое, што кіруючыя арганізацыі пасобных рабкаў і сельсаветаў пярэдка праходзяць міма падобных фактаў, ня ўскліваюць своячасовых і суровых мер супроць дэзарганізатараў загатовак. Як магло, напрыклад, здарыцца, што ў **Горацкім** раёне па вачох у кіруючых арганізацый за апошні час разбазарвана мясной прадукцыі на 30 тыс. руб.? Адналёгчыя факты маюць месца ў **Гарадоцкім** раёне. **Падобнага роду практыку нічым апраўдаць нельга.**

За разбазараньне і зрыў мясазагатовак ЦК КП(б)Б **вынес спагнаньне сакратару гарадоцкага райкому КП(б)Б і старшыня райвыканкому. Зьняты так сама з работы загадчык Жыткавіцкай, Горацкай, і Стара-Дарожскай кантор «Загатжывёлы».** Гэта паказвае пас лужыць суровым **папярджаньнем** для кіраўніцтва ўсіх тых раёнаў, якія яшчэ і зараз плятуцца ў хвасьце мясазагатовак.

Абавязак раённых арганізацый, сельсаветаў — у корані перасякаць усялякія дзеяньні загатоўчых, кааперацыйных і іншых арганізацый, што вядуць да разбазараньня жывёлы, да зрыву пляну загатовак і снабжэньня рабочых мясам.

Дабіцца крутога павышэньня тэмпаў загатовак, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну**ў** маскта толькі тады, калі на справе будзе разгорнута работа ў калгасах, сярод адпаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў. У першую чаргу трэба абвясьціць самую жорсткую барацьбу разбазараньню мясной таварнай прадукцыі, ізмяненьням адсталых калгасьнікаў і апартуністычных элементаў — процідаставіць свае месьніцкія спажывецкія інтарэсы агульна - дзяржаўным. Такое процістаўленьне падагравацца кулаком у мэтах сарваць выкананьне пляну.

Там, дзе прытуплена клясавая пільнасьць, дзе ў кіраўніцтве калгасу апынуўся апартуніст і падкулачнік, там кулак пакінае плёны сваёй дзейнасьці. Так здарылася ў калгасе **«Бальшавік»**, **Старобінскага** раёну, дзе па «мясцовыя патрэбы» пры недавыкананьні пляну забіта 47 сьвіней. Такія-ж факты мелі месца ў пасобных калгасах іншых раёнаў.

З усёй сілай паўстае задача **ўзмацненьня масава - растлумачальнай работы — растлумачэньня кожнаму калгасьніку кулацкай сутнасьці рвацкіх тэндэнцый і тэй шкоды, якую прыносіць разбазараньне мясной прадукцыі калгасьніку, і калгасу, і дзяржаве.**

Партыйныя ячэйкі, сельсаветы, кожны работнік, які зьвязан з акыцыцыяньнем гэтай справы, павінны поўнасьцю ўразумець, што на канкрэтных фактах барацьбы з кулацка - рвацкімі тэндэнцыямі, барацьбы за мясазагатоўчы плян, акрамя ўсяго, мы **перарабляем псыхіку калгасьніка, ператвараем яго ў сапраўднага сацыялістычнага работніка.**

Узмацняючы работу ў калгасах, разам з тым **нельга ні ў якім выпадку абыходзіць аднаасобнага сэктару.** Становішча загатовак яскрава паказвае, што гэты вучастак за многіх месяцох недаацэньваецца, што іменна споты патрэбна зарэз накіраваць сілы і ўвагу.

Недастатковая за апошні час паслаблена работа па здачы мясной таварнай прадукцыі саўгасамі **Сьвінаводтрэсту** і сьлотамай **Сьвінаводкалгассаюзу.** У спалучэньні са слабасьцю работы па аднаасобным сэктары гэта дало надзвычайнае паніжэньне ўдзельнай вагі сьвіней у агульных загатоўках.

Тут мощна адбіўся апартуністычны спакой, стаўка на самацёк у работе кіраўнікоў раду саўгасаў, паяўнасьць у паасобных месцах буржуазна-рвацкіх тэндэнцый і **нераспарадчасьць** апэрацыйнага кіраўніцтва адпаведных цэнтральных установаў.

Кіраўніцтва гэтых сыстэм зьверху да нізу абавязана **на справе падпарадкаваць работу СТКФ і саўгасных сьвінафэрм цэнтральнай задачы — акуратнаму выкананьню пляну здачы мясной таварнай прадукцыі дзяржаве.**

1, нарэшце, **ва ўвесь упор** трэба зараз паставіць пытаньне аб спачатку ні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Гэтая частка пляну выкананна перагрупчальна ў малой ступені. Па асобных раёнах (**Барысаў, Быхаў, Бялынічы, Гомель**) **няма зусім** вестак аб спачатку ні цьвёрдых заданьняў. У гэтым пытаньні больш, чым дзе-б там ні было, нельга цярпець марудласьці. У нашым распараджэньні ёсьць усе магчымасьці, каб прымусіць кулака поўнасьцю і ў тэрмін выпаўняць заданьні дзяржавы.

Змагаючыся за поўнае і своячасовае выкананьне мясазагатоўчага пляну, раённыя кіруючыя арганізацыі, партыйныя ячэйкі павінны ўзяць пад пільнасьць нагляд і аказваць патрэбную дапамогу загатоўчаму апарату. **Час ужо дабіцца выразнай работы загатоўцаў, хуткага выкананьня імі важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.**

Другі квартал — важнейшы этап мясазагатовак.

У гэтым квартале трэба паставіць работу так, каб забясьпечыць у далейшым пакрыцьцё эскізьнанасьці першага кварталу і поўнае выкананьне гадавога рэспубліканскага пляну загатовак жывёлы.

За якасьць, высокі ўраджай, скарочаныя тэрміны сяўбы!

КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ КАЛГАС ІМЯ ДПУ ЗАКЛІКАЕ АДКАЗАЦЬ КРЫМСКІМ І МАСКОЎСКІМ УДАРНІКАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁЎ

ДА УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ, КАЛГАСЬНІЦ, АГРАНОМАЎ, ДА УСІХ РАБОЧЫХ І СПЭЦЫЯЛІСТАЎ САЎГАСАЎ І МТС, ДА УСІХ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ—АДНААСОБНІКАЎ БССР

Напярэдадні выхаду ў поле мы, калгасьнікі калгасу імя ДПУ, Менскага прыгараднага раёну, на сваім агульным сходзе абтаварыўшы ліст першай Маскоўскай абласной канферэнцыі калгасьнікаў і ліст ударнікаў палёў Крымскай АССР, дэтальна праверылі сваю гатоўнасьць да трэцяй бальшавіцкай вясны, абмеркавалі, як лепш і хутчэй выканаць указаньні партыі аб далейшым умацаваньні калгасу, намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па ўзьняцьці ўраджайнасьці калгасных палёў.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і не лепінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным, у жорсткай барацьбе з нашым злейшым ворагам—кулаком і яго агентурай, калгасы БССР ужо дасягнулі вялізарных перамог у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, ва ўмацаваньні калгаснай вытворчасьці.

Яшчэ ў мінулым 1931 г. наш калгас паказаў прыклад бальшавіцкай барацьбы за ўраджай, за высокую таварнасьць сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Пасеўны плян быў поўнасьцю выканан і перавыкананп. Пасажана 60 гэкт. саду. Зазяблілі ўвесь яравы клін у разьмеры 256 гэкт. Павялічылі стада буйнай рагатай жывёлы за кошт куплі на 22 шт. і за кошт гадоўлі маладняка на 33 шт. 27 лепшых ударнікаў атрымалі прэмії.

Ня гледзячы на стыхійныя няпрчасьці (зьнішчэньне на 50 проц. ураджаю градам), калгас поўнасьцю выканаў абавязкі перад дзяржавай, здаўшы 285 тон бульбы (142 проц.пляну), 339 тон гародніны (103 проц.), 5 тон збожжавых (100 проц.), 230 цэнт. малака (153 проц.).

Пры разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў за 1931 г. калгасьнікі атрымалі на 1 працадзень: збожжавых 1,12 кгр., бульбы—3,5 кгр., гародніны — 2,2 кгр., коранплодаў—1,6 кгр., грубых кармоў—1,2 кгр. і грашыма — 86 кап. Матар'яльна-бытавы ўзровень бедняка і серадняка значна павысіўся ў параўнаньні з мінулым аднаасобнай гаспадаркай.

Наш калгас, пачынаючы з восені, па-баявому рыхтаваўся да трэцяй бальшавіцкай вясны. У выніку прыкладнай работы кожнага калгасьніка вую сяўбы падрыхтаваныні. Пасеньвую сяўбу падрыхтаваныні. Пасеньнем усіх культур калгас цалкам забясьпечан толькі таму, што была праяўлена вялізарная актыўнасьць калгасьнікаў па мабілізацыі сваіх унутраных рэсурсаў. Рамонт сельскагаспадарчага інвэнтару і збруі скончан яшчэ 29 сакавіка. Створан і захаваны бранізаваны кармовы фонд на час веснавой сяўбы. З Менску вывезена гною замест 2.500 вазоў 3.330 вазоў, а таксама ёсьць 2.000 вазоў свайго ўласнага гною.

Рашаючым зьвяном у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы была барацьба за правільную арганізацыю працы ў калгасе, за стварэньне пастаянных вытворчых брыгад. Мы дэтальна прапрацавалі пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб брыгадзе. Зараз кожны калгасьнік добра ведае значэньне пастаяннай вытворчай брыгады, значэньне апэнкі працадня ў залежнасьці ад выніку работы брыгады.

На аснове вытворча-фінансавага пляну мы арганізавалі 6 вытворчых гародніх вучасткаў (з далучэньнем да іх палявых культур), стварылі 6 пастаянных вытворчых брыгад. Прызначан склад брыгадзіраў з самых лепшых калгасьнікаў. **За кожнай брыгадай замацаван пэўны вытворчы вучастак, дана вытворчае заданьне, паказаны тэрміны выкананьня работ, колькасьць працадзён, нормы выпрацоўкі, ураджайнасьць і прыкладная вартасьць працадня.**

За кожнай брыгадай, а ў брыгадзе за кожным калгасьнікам паасобна, замацаваны коні, сельска-гаспадарчы інвэнтар і ўстаноўлена персональная адказнасьць за даручаную работу, за эфэктыўнае скарыстаньне і захаваньне сродкаў вытворчасьці. Толькі правільна пабудаваная пастаянная вытворчая брыгада дае нам магчымасьць канчаткова зьнішчыць абязьлічку.

Чатыры брыгады заключылі паміж сабою сацдагавары па лепшае і найхутчэйшае правядзеньне бальшавіцкай вясны. Большая частка калгасьнікаў унутры брыгад абвясьціла сябе ўдарнікамі і прыняла на сябе рад канкрэтных абавязкаў па сяўбе. Для прэміраваньня ўдарнікаў, якія прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы калгасу да выхаду ў поле, вылучан фонд у суме 600 руб. Вылучан таксама прэміяльны фонд у 700 руб. па час веснавой сяўбы.

Па прыкладу крымскіх ударнікаў **мы абавязваемся ўсю сяўбу скончыць на працягу 20-22 дзён:** збожжавых да 10 мая, бульбы і раньняй гародніны—да 20 мая і іншых культур—да 25 мая.

Наша гаспадарка спэцыялізуецца ў плода-гародным напрамку. Плян сяўбы 73 гэкт. гародных культур, 65 гэкт. бульбы, 10 га коранплодаў, 34 га кармовых траў, 21 га бабовых культур і 70 гэкт. збожжавых памі будзе поўнасьцю выканан.

Заключыўшы сацыялістычны дагавор з калгасам імя Войкава, **мы абавязаліся ўзьняць ураджайнасьць нашых палёў на 25 проц. вышэй заданьня, якія ўстаноўлены райкалгассаюзам.** Канкрэтна мы будзем змагацца за выхад з аднаго гэктара: капусты—210 цэнт., гуркоў—250 цэнт., бручкі—190 цэнт., морквы — 120 цэнт., памідораў—120 цэнт., бульбы раньняй—90 цэнт., позьняй — 150 цэнт. і збожжавых—12 цэнт. Мы паставілі сваёй мэтай сярэднягадовы ўдой ад адной каровы давесьці да 2,5 тыс. літраў.

У мэтах максымальнага павышэньня ўраджайнасьці будзем весьці сыстэматычную барацьбу за якасьць апрацоўкі глебы, уводзім пастаянны гародны севазварот, будзем сеяць выключна пратручаным насеньнем, устанаўлием радковы пасеў як збожжавых, так і гародных культур.

У парадку сацыялістычнай калгаснай дапамогі мы здаем у распараджэньне райкалгассаюзу 12 кгр. гароднага насеньня і 700 пудоў пасеннай бульбы, з якой 120 пудоў сабралі калгасьнікі са сваіх уласных рэсурсаў. Вылучаем дзьве брыгады для дапамогі і перадачы вопыту па арганізацыі вытворчых брыгад нашым тром суседнім калгасам.

Заклікаем усе калгасы БССР, усіх беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў па нашым прыкладзе ўпарта змагацца за скарачэньне тэрміну сяўбы, за павышэньне ўраджайнасьці, таварнасьці сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Уся ўвага калгасаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў павінна быць сканцэнтравана перш за ўсё: у ільнаводчых раёнах па выкананьні пляну пасеву ільну і канапель, у прыгарадных і жывёлагадоўчых раёнах—пасеву бульбы, кармовых траў і гародніны.

У гэтым годзе не павінна быць ніводнага калгасу, саўгасу, бедняка і серадняка—аднаасобніка, які-б поўнасьцю ня выканаў свайго пасеўнага пляну. **Павышэньне даходнасьці, таварнасьці, своячасовае выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай — баявая здача кожнай гаспадаркі.**

Рашаючыя перамогі ўдарнікі палёў Крыму атрымалі ў выніку правільнай арганізацыі працы ў часе сяўбы, сапраўднага шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, узьняцьця на вышэйшую ступень працоўнай дысцыпліны. Вытворчая брыгада, як асноўнае зьвяно ў арганізацыі калгаснай працы—вось ключ для вырашэньня посьпехаў сяўбы кожнага калгасу БССР.

Клясавы ворат—кулак і яго агентура—правыя і «левыя» апартуністы—вядуць і будуць весьці дэзарганізатарскую работу па разбурэньні калгасаў з сярэдзіны, за зрыў пасеўных плянаў, супроць пастаянных вытворчых брыгад.

Мы выключылі з калгасу 3-х кулакоў—Карзюка, Радзевіча, Сырава, якія пралезьлі ў калгас выключна з дэзарганізатарскай мэтай, з мэтай разбураньня сацыялістычнай гаспадаркі. Кулаку, клясаваму ворагу на месца ў калгасе.

Трэба яшчэ больш згуртаваць калгасны актыў, усіх калгасьнікаў на далейшую непрымірымую барацьбу з клясавым ворагам—кулаком, уважліва выпраўляць памылкі адсталых калгасьнікаў, вырашчаць кожнаму сацыялістычныя навыкі добрасумленных адносін да сродкаў вытворчасьці.

Таварышы калгасьнікі, беднякі і сераднякі—аднаасобнікі! Мы заклікаем вас яшчэ больш згуртавацца вакол КП(б)Б, баявым выкананьнем задач трэцяй бальшавіцкай сяўбы яшчэ больш умацаваць пазыцыі сацыялізму ў нашай краіне, умацаваць яе абароназдольнасьць, ператварыўшы кожны калгас і саўгас у цьвёрдую крэпасьць Савецкага саюзу.

Па даручэньні агульнага сходу калгасьнікаў калгасу імя ДПУ, Менскага прыгараднага раёну, які адбыўся 26-IV-32 г., гэты ліст падпісалі.

Е. Изаев
Яцкевіч
Пономарэнко
Ясемяко
Романовский
Шашкоў
Юрмишко
Калинаў П. А.

Рабочую сілу--тарфяным палём

Тарфяная прамысловасьць БССР за апошнія тры гады дабілася значных посьпехаў, далёка пасунулася наперад у сваім развіцьці.

Досыць паказаць, што штогодні рост торфаздабычы значна перавышае намячэньні пяцігадовага пляну. Калі пяцігадовы плян намячаў у 1933 г. здабыць 516.000 тон торфу, дык ужо ў 1931 годзе здабыта 376.000 тон, а ў бягучым—павінна быць загатоўлена ня менш 1,5 млн. тон. Такім чынам, у апошнім годзе пяцігодкі тарфяная прамысловасьць павінна значна перавыканаць намячэньні пяцігадовага пляну.

Яшчэ большы размах атрымае тарфяная прамысловасьць у другой пяцігодцы. У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб «асноўных установках для складаньня другога пяцігадовага пляну» падкрэслена, што здабыча торфу ў 1937 годзе павінна быць даведзена да 10 млн. тон супроць 1,5 млн. тон у 1932 годзе.

Вялізарныя дасягненьні мае тарфяная прамысловасьць у галіне росту рабочай сілы. Так, у 1930 годзе на торфараспрацоўках па сыстэме Белторфу было занята 7.774 рабочых, у 1931 годзе—11.250 рабочых; у 1932 годзе павінна быць занята ня менш 14.040 рабочых, ня лічачы тых рабочых, якія будуць заняты на заводах спажыўцоў і Белпрамсаюзу.

Колькасьць рабочых, занятых у тарфяной прамысловасьці, расьце ня толькі за лік павялічэньня сэзоннікаў, але і за лік стварэньня пастаянных кадраў. Ужо ў бягучым годзе лік пастаянных рабочых, занятых на заводах круглы год, павінен быць даведзен да 4.340 чалавек. Гэта лічба асабліва відавочна гаворыць аб посьпехах тарфяной прамысловасьці, калі мы адзначым, што пяцігадовы плян прадугледжвае мець у 1933 г. 407 пастаянных рабочых.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, тарфяная прамысловасьць, у параўнаньні з іншымі галінамі народнай гаспадаркі, працуе нездавальняюча, яе тэмпы адстаюць ад запатрабаваньняў народнай гаспадаркі.

Прамфінплян 1931 году выканан толькі на 53 проц. Значнае адставаньне ёсьць і ў першым квартале г. г.

Бясспрэчна, што асноўнай прычынай адставаньня зьяўляецца невыстарчальная яшчэ перабудова работы тарфяной прамысловасьці на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна, у прыватнасьці яго ўказаньняў аб **арганізаваньні наборы рабочай сілы і замацаваньні яе на вытворчасьці.** Той факт, што ў мінулым сэзоне цякучасьць рабочай сілы па торфазаводах БССР складала 200 проц., а па некаторых заводах (Асінторф, «Шлях сацыялізму») яна даходзіла нават да 300 проц., наглядна сьведчыць аб вельмі слабай рабоце па арганізаваным наборы рабочых-тарфянікаў.

У выніку таго, што некаторыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі торфазаводаў у часе вярбоўкі правялі апартуністычную недаацэнку клясавай барацьбы на вёсны, не зьвярнулі належнай увагі на склад завербаваных; у радзе месц у асяродзішча рабочых-тарфянікаў пралезьлі кулацкія элементы, якія распальвалі сярод рабочых кулацка-рвацкія тэндэнцыі, агітавалі за ўход іх з торфараспрацовак.

Адной з прычын вялікай цякучасьці рабочай сілы зьявілася невыстарчальная ўвага да культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых з боку раду парткомаў і торфкомаў.

Нельга сказаць, што справа ў гэтым годзе значна палепшылася. Многія заводы, як і летась, недаацэньваюць значэньня арганізаванага набору рабочай сілы, ігнаруюць заключэньне дагавораў з калгасамі, не аддаюць увагі клясаваму адбору завербаваных.

Паводле даных Белторфу, плян вярбоўкі рабочай сілы на 15 красавіка выканан на 104,3 проц., але гэта выкананьне дасягнута за лік трох заводаў (імя 1 мая, імя Даўмана, «Шлях сацыялізму»), якія завербавалі па 50—60 проц. больш патрэбнай колькасьці рабочых. Большасьць торфазаводаў яшчэ далёка не забясьпечана рабочай сілай. Так, завод «Чырвоная Беларусь» выканаў заданьне па вярбоўцы на 41,8 проц., Смалявіцкі завод—на 73,9 проц.

Кіраўніцтва заводу «Чырвоная Беларусь», напрыклад, не заключыла ні аднаго дагавору з калгасамі, не арганізавала ні аднай брыгады. Сьпісы завербаваных аказаліся напалову фіктыўнымі, бо яны складзены былі завочна, бяз згоды саміх калгасьнікаў і аднаасобнікаў. У некаторых месцох у сьпісы заносіліся дзеці, інваліды і нават старшыні калгасаў. У выніку завод замест 619 рабочых-тарфянікоў завербаваў толькі 269 рабочых.

Усе гэтыя факты гавораць аб неабходнасьці пералому ў забясьпячэньні торфаздабычы рабочай сілай. Апартуністычнаму самацёку, недаацэнцы і ігнараваньню арганізаванага набору рабочай сілы неабходна даць рашучы адпор.

Шляхам мабілізацыі калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў і правядзеньня шырокай масавай работы трэба разьбіць усе спробы кулацкіх элементаў перашкодзіць пасьпяховаму набору рабочай сілы, распальваць рвацкія настроі, сарваць работу на балотах.

Да пачатку сэзону здабычы павінна быць падрыхтавана выстарчальная колькасьць кваліфікаваных рабочых—трактарыстаў, матарыстаў для кіраўніцтва машынамі. Адначасова павінны быць забясьпечаны тэхнічна і палітычна-пісьменнымі, ведаючымі вытворчасьць арганізатарамі—брыгады і вучасткі торфздабычы.

Калі па здабычы торфу вялікую ролю адыгрывае машына, дык на сушцы і ўборцы торфу важнейшае значэньне набывае правільная расстаноўка рабочай сілы і ўкараненьне сацыялістычных форм працы. Вось чаму падрыхтоўка кваліфікаваных брыгадзіраў зьяўляецца адной з адказных частак усіх работ, якія павінны быць праведзены да пачатку сэзону.

Посьпех торфздабычы вырашае рашучае правядзеньне ўказаньняў тав. Сталіна, ліквідацыя абязьлічкі ў догляде за машынамі, ліквідацыя ўраўнілаўкі зарплаты, максымальны ахоп рабочых здзельшчынай.

У бліжэйшыя дні павінна быць скончана пабудова інтэрнатаў, амбуляторый, лазьняў, сушылак.

Вялікая работа павінна быць праведзена па падрыхтоўцы сталовак грамадзкага харчаваньня.

Ажыцьцяўленьне гэтых задач забясьпечыць выкананьне праграмы выпрацоўкі торфу ў чацьвертым заключным годзе пяцігодкі.

За 20 дзён замест 23

КЛІМАВІЧЫ. На заклік ударнікаў палёў Крыму, бальшавіцкай барацьбой за праграму сяўбы адказвае калгас імя «Рабочы», Кісялёва-Будзянскага сельсавету. Абгаварыўшы ліст ударнікаў Крыму, калгасьнікі калгасу «Рабочы» ўзялі на сябе рад абавязкаў па правядзеньні сяўбы.

Калгас сяўбу сустрэў падрыхтаваным. Насенныя фонды ссыпаны ў разьмерах, неабходных для поўнага забясьпячэньня пасеўплошчы. Не хапае толькі каля 30 проц. ільнасемя, што калгас папаўняе рэалізацыяй аблігацый насеншазыкі. Рэалізавана ўжо аблігацый на 4 цэнт. ільнасемя, 4 цэнт. ячменю і 33 цэнт. бульбы.

У парадку міжкалгаснай узаемадапамогі, калгас «Рабочы» пазычае калгасам «Пралетарскай свабодзе»—33 цэнт. кармоў, «Праўдзе»—5 цэнт. насеньня збожжавых.

Вытворчыя брыгады ў калгасе «Рабочы» створаны, да кожнай з іх прымацован інвэнтар і даны вытворчыя заданьні. Нормы выпрацоўкі даведзены да калгасьнікаў. Цягавая сіла забясьпечана поўнасьцю кармамі і добра даглядаецца. Брыгадзірамі вылучаны лепшыя калгасьнікі, якія прайшлі дзесяцідзённыя курсы.

Распачаўшы палявыя работы, брыгады разгарнулі паміж сабою сацспаборніцтва на пасьпяховае і лепшае правядзеньне сяўбы.

Першымі заключылі дагавор брыгада Кургузава з брыгадай Гапчарова. Для павялічэньня ўраджайнасьці імі ўзяты абавязкі: на 50 проц. правесьці радковы пасеў, скараціць тэрмін сяўбы да 20 дзён.

Гэтыя брыгады першымі пачалі сяўбу. А цяпер калгасам ужо засена 50 гэкт. канюшыны, 12 га ячменю, 4 га яравога жыта і 2 га шпаніцы.

З першых дзён палявых работ уведзена зьвялічэньна, цьвёрдыя нормы выпрацоўкі і строгі ўлік працадзён. На полі шырока разгорнута сацспаборніцтва за перавыкананьне норм выпрацоўкі.

Правільна расставіўшы сілы, перавёўшы ўсе работы на зьдзельшчыну, калгас скарачае тэрмін пасеву з 23 дзён да 20.

Калгас па прыкладу ўдарнікаў Крыму аказвае дапамогу калгасу «Пралетарская свабода». У гэты калгас выехала буксірная брыгада з перадавых калгасьнікаў-ударнікаў.

Пад кіраўніцтвам партячэйкі калгас «Рабочы» пераможна правядзе трэцюю бальшавіцкую сяўбу і праз сацыялістычны буксір будзе дапамагаць адстаючым калгасам.

Г. Хомчанка.

Перадавыя калгасы Магілеўшчыны адзначаюць сяўбу ўзмацненьнем збору насеньня

МАГІЛЕЎ, 24. (Па тэлефону). Калгасы Сідаравіцкага сельсавету «Савецкая Беларусь», «Сталіна», «Ленінскі шлях», «Леніна», «Варашылава», «Камінтэрн», «Камунар Магілеўшчыны», «Якаўлева», «Пралетары» і інш. распачалі масавае ворыва. Па сельсавеце з 20 красавіка ўзорана ўсімі калгасамі 400 га яравога кліну.

Перадавыя калгасы «Чырвоны шлях», «Савецкая Беларусь», «Сталіна» арганізавалі работу па аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага і ЦК КП(б)Б ад 22 лютага і разьбілі ўсю сілу калгасу на вытворчыя брыгады, разгарнулі сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі па лепшую падрыхтоўку і правядзеньне сяўбы. На аснове рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна ліквідавалі абязьлічку.

Нямалая работа праведзена перадавымі калгасамі па лініі дапамогі адстаючым. Так, калгас «Чырвоны сьцяг» арганізаваў фонд міжкалгаснай узаемадапамогі і перадаў калгасам «Ленінскі шлях», «Варашылава» і «Сталіна» 3 тоны сена.

Побач з перадавымі калгасамі, якія па-баявому падрыхтаваліся да сяўбы, ёсьць такія калгасы (імя «Калініна»), якія не забясьпечаны насеньнем і цягавай сілай.

На пленуме сельсавету, які адбыўся, буйнейшыя калгасы ўзялі на буксір адстаючы калгас «Ленінскі шлях» і 21 красавіка з 15-ю плугамі выехалі ў поле на дапамогу калгасу.

Тав. Чарвякоў у Камарынскім раёне

У раёне распачалася масавая сяўба. Усе калгасы раёну прыступілі да палявых работ і сяўбы. На 20 красавіка калгасы засялі 300 га раньніх яравых культур. Уперадзе ідуць калгасы **«Чырвоны араты»**, **«Рухавік рэвалюцыі»**, **«Чырвоны гарадок»**, якія ўжо засялі 78 га. У калгасы і сельсаветы для кіраўніцтва і практычнай дапамогі выехаў увесь райпартактыў.

Для азнаямленьня з падрыхтоўкай і разгортваньнем сяўбы ў раён **прыбыў старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў** і наведаў калгас **«Інтэрнацыянал».** Тав. Чарвякоў, азнаёміўшыся са становішчам падрыхтоўкі да сяўбы ў калгасе, прыняў удзел у агульным ходзе калгасу «Інтэрнацыянал», дзе выступіў з вялікай прамовай аб задачах трэцяй бальшавіцкай сяўбы і падзяліўся з калгасьнікамі сваім уражаньнем аб становішчы калгасу.

Калгасьнікі запэўнілі, што плян веснавой сяўбы будзе імі выканан з посьпехам.

С. Жураўлёў.

Да 1-га мая--закончыць сяўбу раньніх яравых

СЛУЦАК. Калгас **«Чырвоная горка»** адзін з буйнейшых у Сарагоўскім сельсавеце ў Слуцкім раёне—ён налічвае 170 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак в. Сорагі і бліжэйшых хутароў.

Арганізаваўшы 4 палявочныя брыгады па вытворчым прынцыпе, калгас 14 красавіка выступіў у поле. Калгас павінен засеяць 177 га бульбы, 150 га аўса, 26 га ільну, 40 га ячменю, 34 га лубіну, падсеяць 49 га вікі і 100 га канюшыны. Усяго яравы клін складае 547 га.

На 25 красавіка пасеяна 102,5 га аўса—23 проц. пляну, 15 га раньняй бульбы, 24 га лубіну і 15 га канюшыны. Апрача гэтага падрыхтавана 35 га глебы пад засеў. Вывезена 2.000 вазоў гною.

Калгас вядзе сяўбу пад лёзунгам—да 1 мая — вялікага пралетарскага сьвята—закончыць пасеў раньніх яравых культур.

Штодзённая насьценная газэта калгасу «Ударніца» разгарнула масавую барацьбу за якасьць сяўбы.

Пятровіч, Харытончык.

Апошнія весткі з пасеўнага фронту

Калгас „Чырвоны бор" закончыў сяўбу раньніх

ХОЙНІКІ. (Па тэлеграфу). На 27 красавіка ў Хойніцкім раёне засеяна **788 га** раньніх яравых. Калгасамі засеяна **355** га і аднаасобнікамі **433.**

Бальшавіцкія ўзоры барацьбы за раньнюю сяўбу паказаў калгас **«Чырвоны бор»**, які ўжо скончыў сяўбу раньніх.

***

РАГАЧОЎ. (Сьпешнай поштай). Калгасы і аднаасобны сэктар раёну прыступілі да палявых работ. Калгас **«Чырвоны дняпровец»** узараў **61** га, калгас **«Інтэрнацыянал»** засеяў **7** га вікі. Па калгасах **«Будзёнавец»** і **«Чырвоны курган»** праводзіцца сяўба ячменю і інш. збожжавых культур. У калгасе **«Чырвоная асінаўка»** засеян 1 га бульбы.

Палявыя работы распачаты ў 29 калгасах раёну. Усяго па калгасным сэктары Рагачоўшчыны на 22 красавіка ўзарана 358 га і засеяна 19,25 га.

Зусім

IX ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ СССР

Справаздача наркампрацы СССР

(З дакладу т. Ціхона)

Тав. Ціхон пачынае свой даклад з агульнага ўказаньня аб тым, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва суправаджаліся пяўхільным ростам рабочай клясы і паляпшэньнем яе матар'яльнага становішча. Агульная колькасьць рабочых і служачых толькі за два апошнія гады павялічылася ў паўтары разы і дасягнула 18,6 млн. На 1932 г. запраектаваны далейшы рост—да 21 млн. чал. Пераважная маса рабочых у прамысловасьці пераведзена на сямігадзінны рабочы дзень.

Значна павялічыўся ўдзел жаночай працы ў вытворчасьці. У 1931 г. было ўцягнута ва ўсю народную гаспадарку звыш 1 з пал. млн. жанчын. Прыблізна такая жколькасьць будзе ўцягнута і ў гэтым годзе. Удзельная вага жаночай працы ў сацыялістычнай гаспадарцы ўзьнялася з 26,5 проц. у 1928-29 г. да 33 проц. у сучасны момант. Вырасьлі таксама кадры намомант.

Старое, апартуністычнае кіраўніцтва Наркампрацы СССР, на чале якога быў т. Угланаў, не зразумела зрухаў, якія адбыліся ў галіне працы ў сувязі з ростам сацыялістычнай гаспадаркі. Даволі сказаць, што яно прапусьціла такі вялізарнай важнасьці факт, як ліквідацыя беспрацоўя ў нашай краіне.

Арганізаваны набор рабочай сілы

Ліквідацыя беспрацоўя і сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі зусім па-новаму паставілі пытаньне аб забесьпячэньні народнай гаспадаркі рабочымі кадрамі. Многія гаспадарчыя арганізацыі арганізавалі набор рабочых на аснове дагавораў з калгасамі і калгаснікамі. Гэта прывяло да скарачэньня цякучасьці рабочай сілы.

Органы працы перашлі на плянавае разьмеркаваньне раёнаў вярбоўкі, узялі над сваё веданьне кантроль і рэгуляваньне арганізаванага набору рабочых, а гаспадарчым органам параданы вярбоўка і падрыхтоўка рабочых.

Побач з арганізаваным прыцягненьнем рабочай сілы з калгасаў, паасобныя прадпрыемствы шырока практыкуюць уцягненьне на прадпрыемствы жонак і членаў сем'яў рабочых.

Арганізаванае прыцягненьне рабочых прывяло і да большай устойлівасьці кадраў па прадпрыемствах і набудовах. Цякучасьць рабочых у параўнаньні з 1930 г. значна зьнізілася.

Аднак, цякучасьць усё яшчэ знаходзіцца на высокім узроўні, і барацьба з ёй павінна працягвацца самым рашучым чынам. Прафсаюзы могуць і павінны дапамагчы ў гэтай барацьбе: з аднаго боку ўважлівымі адносінамі да задаваленьня ўзросшых культурна-бытавых запатрабаваньняў рабочых і з другога — ажыцьцяўленьнем кантролю за дзейнасьцю гаспадарчых органаў па арганізаваным прыцягненьні рабочай сілы і за будаўніцтвам кватэр і камунальных устаноў.

Паляпшэньне дабрабыту рабочай клясы

Заработная плата рабочых у СССР дае няўхільны рост як у цэлым па ўсёй народнай гаспадарцы, так і па паасобных яе галінах.

Палітыка рэгуляваньня зарплаты выходзіла з неабходнасьці падцягваньня яе ў адстаючых галінах і больш высокага тэмпу росту зарплаты рабочых відучых галін. Такім чынам, на першае месца па ўзроўні зарплаты вышла машына-будаўнічая прамысловасьць, па другое месца — чорная мэталюргія, на трэцяе месца —каменнавугальная і г. д.

Бюджэт сям'і рабочага ў сувязі з ліквідацыяй беспрацоўя і прыцягненьнем у вытворчасьць членаў сем'яў рабочых значна ўзрос, асабліва па індустрыяльнай групе.

Абавязковай умовай, на аснове якой будзе праходзіць павялічэньне зарплаты, зьяўляецца стымуляваньне росту прадукцыйнасьці працы. Таму асаблівую ўвагу набываюць хутчэйшая перабудова сыстэмы зарплаты, поўная ліквідацыя ўраўнілаўкі і максымальнае ўкараненьне зьдзельшчыны.

У сучасны момант пераход прамысловасьці, якая была ў веданьні ВСНГ, на сямігадзінны рабочы дзень у асноўным закончан. На 1 сьпудзеня г. г. на 7-гадзінным рабочым дні працавала па ўсёй прамысловасьці б. ВСНГ 83,1 проц. рабочых. Вопыт чатырохгадовай практыкі пераходу прамысловасьці на 7-гадзінны рабочы дзень паказаў, што скарачэньне рабочага дня ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца фактарам, спрыяючым росту народнай гаспадаркі і паляпшаючым тэмпы індустрыялізацыі краіны.

Охрана працы, тэхніка бясьпекі, сацыяльнае страхаваньне

Асыгнаваньні на охову працы за апошнія гады значна ўзрасьлі. Калі ў 1929-30 г. было асыгнавана 99,8 млн. руб., дык у 1931 г. на охову працы было адпушчана 169,5 млн. руб.

Асабліва значныя асыгнаваньні на охову працы ў рапаючых галінах прамысловасьці.

Лепш таксама выкарыстоўваюцца і сродкі, асыгнаваныя на охову працы і тэхніку бясьпекі.

Аднак, ёсьць яшчэ паасобныя галіны прамысловасьці, якія несваячасова і няпоўнасьцю выкарыстоўваюць сродкі, асыгнаваныя на тэхніку бясьпекі.

Лік застрахаваных у СССР за перыяд паміж VIII і IX зьездамі прафсаюзаў вырас з 12,7 млн. у 1929 г. да 17.150 тыс. у 1931 г. і 20.700 тыс. па пляне на 1932 г.

Бюджэт сацыяльнага страхаваньня ўзрос з 1.425 млн. руб. да 3.534 руб. у 1932 г.

Колькасьць работнікаў, пасланых у дамы адпачынку і санаторыі сацстраху, узрасла з 540 тыс. у 1928-29 г. да 1 млн. у 1931 г. і 1,5 млн., паводле пляну 1932 г.

Таксама павялічаны выдаткі на прафілактычныя і сацыяльна-бытавыя мерапрыемствы, на будаўніцтва і ўтрыманьне ясьлей, на дзіцячыя сады, і харчаваньне школьнікаў, на дыетычнае харчаваньне і г. д.

На аснове дырэктыў партыі і V пленуму ЎсеЦСПС праведзена рэарганізацыя органаў сацыяльнага страхаваньня.

***

У аснову сваёй работы Наркампрацы і яго органы павінны пакласьці хутчэйшае правядзеньне ў жыцьцё пастаноў XVII партканфэрэнцыі і рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна.

Наркампрацы СССР забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду ў пытаньнях працы.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БАЯВОЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА

З выступленьня сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО на ўсебеларускай нарадзе па дарожным будаўніцтве

Ахарактарызаваўшы гаспадарча-палітычную важнасьць дарожнага будаўніцтва, тав. **Гікало** дае падрабязны аналіз становішча з падрыхтоўкай да будаўніцтва.

— Калі меркаваць толькі па лічбах, — гаворыць тав. Гікало,—дык справа стаіць быццам ня так ужо дрэнна. Заключаны дагавары на 73 проц. рабочых. Каменьня падвезена да месца работ на 66 проц. Супроць мінулага году тут вялікія дасягненьні. Але, адна справа, калі гэта запісана на паперы, другая справа—у сапраўднасьці. Вельмі часта, калі даклад ваюць, малюнак прадстаўляецца бліскучым, а калі праверыць—на справе ня зусім так. Прыведзеныя мною лічбы найбольш блізкі да ісьціны. Аднак, трэба кожнаму з нас у паасобку і нам тут таксама праверыць ці ўсё гэта так, ці няма тут перапавялічэньняў, ці няма «очковтирательства». Трэба праверыць, ці замацавана гэта работа.

Дрэнна з гравіем і пяском. Загатоўлена ўсяго 6-10 проц. пляну. Гэта паказвае, што неабходных бальшавіцкіх тэмпаў у гэтай работе няма. Тав. Гікало завастрае ўвагу нарады на пытаньні асваеньня мэханізмаў і выкарыстаньня іх, з чым у нас справа пастаўлена далёка не на належную вышыню. Так, на 5-м дарбудвучастку камнядрабілкі выкарыстоўваюцца толькі на 50-60 проц., прычым прадукцыйнасьць працуючых машын не перавышае 50 проц. нормы.

Такое недапушчальнае становішча з выкарыстаньнем мэханізмаў тлумачыцца перш за ўсё адсутнасьцю належнай работы па асваеньні іх, па аўладаньні тэхнікай.

У бягучым годзе,—гаворыць тав. Гікало,—мэханізмы павінны быць выкарыстаны на 100 проц. Гэта справа ўпіраецца ў пытаньні забесьпячэньня кваліфікаванай рабочай сілай, узьняць ця кваліфікацыі тых, што стаяць ля машын, у правільнай арганізацыі сыстэмы заработнай платы. Каб дасягнуць неабходнага эфэкту у выкарыстаньні машын, мэханізмаў, рабочай сілы, матар'ялаў, мы павінны на справе рэалізаваць 6 гістарычных указаньняў тав. Сталіна.

Вялікае значэньне для забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну мае папастаноўка рабочаа снабжэньня. Тут трэба сказаць, што дарожнікі па частцы снабжэньня знаходзяцца ня ў дрэнным становішчы параўнальна з іншымі будаўнічымі групамі рабочых. Пытаньне заключаецца ў тым, каб правільна выкарыстаць тое, што адпускаецца, каб той паёк, тыя харчы, якія адпускаюцца рабочым, дзе-небудзь—не засталіся, каб яны дайшлі да рабочага поўнакаштоўным пайком. Трэба зьвярнуць увагу на якасьць грамадзкага харчаваньня. Можна адпусьціць шмат прадуктаў, але калі іх дрэнна прыгатаваць, дык—грош цана ўсім гэтым прадуктам. Трэба таксама выкарыстаць усякія мясцовыя рэсурсы для павялічэньня фонду снабжэньня. Трэба ў гэтым пытаньні праяўляць ініцыятыву.

Вялікае значэньне мае таксама пытаньне разьмяшчэньня рабочай сілы. Трэба дабіцца добрага абсталяваньня бараках, чыстаты ў іх, культурнага абслугоўваньня. Гэта важнейшая задача камуністаў-дарожнікаў.

Зусім відавочна, што правільна вырашыць усе гэтыя задачы, якія стаяць у сувязі з выкананьнем пляну дарожнага будаўніцтва, немагчыма без разгортваньня партыйна-масавай работы. Зусім невыпадкова пастаўлены ва ўсю шырыню на гэтай нарадзе пытаньні партыйна-масавай работы. Рад спраў паказвае, што там, дзе партыйна-ма-

савая работа не разгорнута, ёсьць шмат хібаў, там уся работа ідзе слаба. Лепшым доказам гэтага зьяўляецца прыклад усім вам вядомай зэмбінскай справы. За пастаноўку партыйна-масавай работы павінны адказваць партарганізатары, сакратары партыйных ячэек. Гэтага мы будзем патрабаваць з усёй рашучасьцю.

Мы патрабуем ад кожнага камуніста, кожнага партработніка дарожнага будаўніцтва бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну. Мы не дапусьцім ніякай расхлябанасьці, ніякага аслабленьня работы. Трэба вытруціць разважаньні аб тым, што, вось, мой, у нас атрымаўся прарыў, але мы яго як-небудзь паціхеньку выправім. Трэба па-бальшавіцку, моцна, не саромяючыся, ставіць пытаньні, зьвязаныя з забесьпячэньнем выкананьня пляну. У пытаньнях барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва, за абарону краіны, за інтарэсы рабочай класы, за бытавое абслугоўваньне яе—бальшавік павінен па любым вучастку змагацца так, як гэта падабае бальшавіку. Ня можа быць ніякіх спасыланьняў на тое, што вось я-б сказаў, але баюся, што Іван Міхайлавіч пакрыўдзіцца, я-б сыгналізаваў, але баюся, што сакратар адпаведнага партыйнага камітэту пакрыўдзіцца, я-б паставіў пытаньне, але баюся, што магчыма адпаведны кіраўнік ці загадчык пакрыўдзіцца. Гэтага не павінна быць, бо калі мы так будзем працаваць, дык мы ня выраўнаем усіх тых задач, якія перад намі паставіла партыя.

Задача заключаецца ў тым, каб пабольш бываць на мясцох, ахапіць важнейшыя вучасткі работы, апэрацыйна кіраваць, выпраўляць недахопы, дапамагаць у выпраўленьні іх і г. д. Абавязак кожнага камуніста — паведамляць аб тым, што рэбіцца па мясцох.

Дзе-ні-дзе чутны галасы аб нерэальнасьці пляну. Гэта галасы апартуністаў. Тое, што партыя памячае, можна выканаць. У гэтым мы пераканаліся хаця-б па воцыце выкананьня пляну лесазагатовак. Я памятаю, як некаторыя работнікі даказвалі, што плян лесазагатовак немагчыма выканаць. Аднак, калі мы рашуча паставілі пытаньне, калі мы прымусілі сапраўды, закасаўшы рукавы, па-бальшавіцку ўзяцца за работу, плян аказаўся магчымым да выкананьня. Тое-ж самае і ў пытаньні дарожнага будаўніцтва. Плян зусім рэальны. Уся справа ў тым, каб з бальшавіцкай упартасьцю ўзяцца за яго выкананьне.

Важнейшай умовай выкананьня пляну зьяўляецца ў першую чаргу рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна. У гэтым стрыжань пытаньня. Бяз гэтага наогул нельга працаваць.

Пара перабудавацца. Па-новаму працаваць,—гэта значыць менш пісаць рэзалюцый, больш часта бываць на мясцох, у масе, кіраваць апэрацыйна. І Цэнтральнаму Камітэту ў гэтых адносінах трэба яшчэ шмат чаго зрабіць. На важнейшыя вучасткі дарожнага будаўніцтва таксама, як на пасеўны, торфараспрацоўкі і г. д., павінны быць кінуты лепшыя сілы, павінен быць забясьпечан штодзённы апэрацыйны нагляд.

Канчаючы сваё выступленьне, тав. Гікало зварачаецца да ўдзельнікаў нарады—забясьпечыць баявое разгортваньне дарожнага будаўніцтва з тым, каб на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна поўнасьцю выканаць намечаны плян.

— Мы гэта можам зрабіць,—гаворыць тав. Гікало,—абавязаны і бязумоўна зробім.

Дарожнае будаўніцтва забясьпечыць будматар'ялам!

(Агляд рабселькораўскіх заметак)

Абвешчаны ЦК КП(б)Б месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву скончыўся. Аднак, весткі з месц сыгналізуюць, што па радзе раёнаў падрыхтоўка да дарожнага будаўніцтва праведзена нездавальняюча.

Карэспандэнцыя з Лоеўскага раёну (Б. К.) паведамляе аб тым, што раённы штаб, апэрацыйнае кіраўніцтва падмяніў пастановамі і рэзалюцыямі. Патрэбна было вывезьці 1.000 кбм. лесаматар'ялаў, а вывезена толькі 25 кбм. Калектыў рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу 11-га дарбудвучастку выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва 5 дарожна-будаўнічы вучастак па наступных мерапрыемствах: закончыць адвод зямель паводле пляну Белдарбуду раней на адзін месяц. Закончыць рубку і карчоўку лесу да 1 мая 1932 году. Закончыць зямельныя работы супроць пляну раней па адзін месяц. Закончыць пабудову мастоў да 1 ліпеня г. г. Забясьпечыць аб'екты будаўніцтва неабходным матар'ялам і інвэнтаром на 100 проц. Павялічыць прадукцыйнасьць працы на 35 проц. Зьнізіць сабекошт будаўніцтва на 15 проц. Ахапіць рабочых будаўніцтва гаспадарча-разрахунковымі дагаварамі.

АБ ХОДЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ І ПАЧАТКУ СЯЎБЫ У ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ ГОР. МЕНСКУ

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

Канстатаваць, што падрыхтоўка і пачатак сяўбы ў менскіх прыгарадных гаспадарках зьяўляюцца вусім нездавальняючымі і пагражаюць зрывам пасьпяховага правядзеньня і сканчэньня сяўбы.

а) Вызначаная плошча пасеву не забясьпечана поўнасьцю пасеньнем раньняй бульбы, цыбулі, вікі і капюшыны;

б) плян вывазу ўгнаеньня па 15-IV г. г. выкананы толькі на 56 проц., пополу — на 24 проц.;

в) рабочай сілай калгасы забясьпечаны: сталай — на 90 проц., сэзоннай — на 22 проц.;

г) парніковых рам заложана толькі на 78 проц.

Такая падрыхтоўка да сяўбы тлумачыцца безадказнасьцю і бязьдзейнасьцю кіраўнікоў саўгасаў, ЗРК, ЗВК і ТСТ, новыстарчальна разгорнутай партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі масавай работы і слабым апэрацыйным кіраўніцтвам з боку Белкаапсаюзу.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. За лянную бязьдзейнасьць і «очковтирательство» — дырэктара каапгасу ЗРК фабрыкі «Кастрычнік» — тав. Юшкевіча зьняць з работы. Гаркому і гарКК вырашыць пытаньне аб прабываньні тав. Юшкевіча ў партыі і вызначыць новую кандыдатуру дырэктара каапгасу фабрыкі «Кастрычнік».

Дырэктару каапгасу ЗРК «Бальшавік» — тав. Шапашнікаву абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем за недапушчальна дрэннае забясьпячэньне насеньнем і працоўнай сілай. Абавязаць фракцыі ЗРК, партыйныя калектывы і фабкомы «Бальшавік» і «Кастрычнік» прыняць рашучыя меры да ліквідацыі прарываў у правядзеньні веснавой сяўбы па іх прыгарадных гаспадарках.

2. За невыкананьне пляну вывазкі ўгнаеньня, закладкі парнікоў, вярбоўкі рабочай сілы і незабясьпечанасьць насеньнем — дырэктарам каапгасаў: Агародна-малочнага аб'яднаньня Белкаапсаюзу — тав. Шорцу каапгасу ЗВК «Лекерта» — тав. Бураву — абвясьціць вымову.

3. Адзначыць невыстарчальнае непасроднае кіраўніцтва і нагляд за ходам сяўбы ў прыгарадных гаспадарках з боку Менгаркому КП(б)Б і фракцыі гарсавету.

4. Абавязаць дырэктароў каапгасных аб'яднаньняў БКС і каапгасаў, старшынь ЗРК, ЗВК і ТСТ скончыць закладку парніковых рам да 15-га мая 1932 г.

5. Абавязаць дырэктара Плодагароднага аб'яднаньня БКС тав. Зелічонка, сакратароў райкомаў КП(б)Б і старшынь райвыкашкомаў — да 5-V забясьпечыць поўнае выкананьне нарадаў па раньнюю цыбулю і бульбу прыгарадным каапгасам.

У мэтах поўнага выкананьня пляну пасеву раньняй бульбы менскімі прыгарадныя гаспадаркамі — дазволіць БКС не пазьней 1 мая зрабіць перакідку надлішняга пасеньня раньняй бульбы з гаспадарак спажывецкай сыстэмы раёнаў для забесьпячэньня пасеньнымі матар'ялам прыгарадных гаспадарак Менску, Віцебску і Гомеля.

6. У мэтах забесьпячэньня пасеньнымі матар'ялам на будучы год прыгарадных гаспадарак, асабліва Менску, Віцебску, Гомеля і Барысава — абавязаць тав. Мартэнсона (Насенаводтрэст) выдзяліць са сваіх фондаў 500 тон насеннай раньняй бульбы.

7. Абавязаць гарсавет, дырэктароў каапгасаў скончыць вывазку ўгнаеньня і сьмецьця па гароды прыгарадных гаспадарак не пазьней 5 мая, мабілізаваўшы транспарт ЗРК, прадпрыемствы і ўстаноў для дапамогі прыгарадным каапгасам у вывазцы ўгнаеньня і ворыве палёў каапгасаў.

8. Адзначаючы адсутнасьць канцкармоў у прыгарадных каапгасах, што пагражае сваячасоваму правядзеньню веснавой сяўбы, — прапанаваць Саюзпрамкорму — з наяўных фондаў вылучыць прыгарадным каапгасам магчымую колькасьць канцкармоў.

9. Папярэдзіць фракцыю прэзыдыуму Белкаапсаюзу, што ў выпадку няпрыняцьця неабходных рашучых мер па выкананьні пляну сяўбы раньніх і палявых культур—будзе пастаўлена пытаньне аб прыцягненьні вінаватых да партыйнай адказнасьці.

У адносінах дырэктароў каапгасных аб'яднаньняў БКС і дырэктароў усіх каапгасаў даручыць ЦКК-РСІ праз дакладу праверыць іх практычную работу і калі будзе выяўлена, што імі ня створана патрэбнага пералому і не забясьпечана пасьпяховае правядзеньне і сканчэньне сяўбы — вінаватых у гэтым прыцягваць да суровай адказнасьці.

10. Прапанаваць усім райкомам і гаркомам КП(б)Б безадкладна праверыць сумесна з КК-РСІ падрыхтоўку і ход сяўбы ў прыгарадных гаспадарках з вызначэньнем і правядзеньнем практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць пасьпяховае сканчэньне сяўбы. Разгарнуць масавую растлумачальную работу на прадпрыемствах, прымацаваных да каапгасаў, лічачы барацьбу за асваеньне агародаў і павышэньне ўраджайнасьці гародніны — баявой задачай партарганізацыі.

11. На адным з бліжэйшых пасяджэньняў ЦК заслухаць ход выкананьня гэтай пастановы з боку ўсіх паказаных арганізацый, а таксама даклады Гомельскага і Віцебскага гаркомаў па пытаньнях сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

12. Абавязаць рэдактароў газэты «Зьвязда» і «Рабочий» арганізаваць сыстэматычнае асьвятленьне на старонках друку пытаньняў барацьбы за разгортваньне веснавой пасеўкампаніі ў прыгарадных каапгасах.

СТАЛЕВІЧ, КАНАКОЦІН

Да пытаньня аб беларускай мове

Нацыянальная палітыка камуністычнай партыі ўвесь час накіравана на тое, каб забясьпечыць БССР, як і ўсім раней адсталым краінам і абласьцям, якія ўваходзяць у Савецкі саюз, больш высокія тэмпы разьвіцьця і гэтым даць ім магчымасьць хутка ліквідаваць мінулую спадчыну царскага каленізатарскага рэжыму і дагнаць у разьвіцьці сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва перадавыя цэнтры Саюзу. Гэта задача была вельмі яскрава сфармулявана і ў рэзалюцыі X зьезду РКП(б): «Задача партыі заключаецца ў тым, каб дапамагчы працоўным масам не-вялікарускіх народаў дагнаць цэнтральную Расію, якая пайшла наперад». Лепшым доказам ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца БССР, якая пры брацкай дапамозе пралетарыяту Саюзу расьце і мацнее, як сацыялістычная краіна, апэрыраючы ў тэмпах разьвіцьця сярэдніх тэмпы ўсяго Саюзу.

Нацыянальная палітыка ёсьць адна з асноўных частак пытаньня дыктатуры пралетарыяту, яе ўмацаваньня да пераходу да бясклясавага грамадзтва.

Адным з вузлавых пытаньняў сусьветнай рэвалюцыі зьяўляецца нацыянальнае пытаньне. Марксыцка-ленінскі тэзіс самавызначэньня нацый аж да аддзяленьня мабілізаваў і мабілізуе ў барацьбе супроць імпэрыялізму і фашызму мільённыя масы рабочых і сялян і шматмільённыя рэзэрвы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, якія знаходзяцца ў прыгнечаных краінах і калёніях.

Іменна так і толькі так падыходзяць да нацыянальнага пытаньня ўсе камуністычныя партыі, якія аб'яднаны пад сьцягам Леніна, пад сьцягам Камінтэрну.

Правільная пастаноўка пытаньня нацыянальнай палітыкі на ўмовах КПЗБ мабілізоўваць шырокія масы працоўных па барацьбу з фашызмам, за Кастрычнік па захадзе. Пасьлядоўная барацьба за ленінскую нацыянальную палітыку ва ўмовах БССР зьяўляецца зарукай уцягненьня шырокіх колаў працоўных у будаўніцтва сацыялізму і ўзмацненьня брацкага адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцей. І ў Заходняй Беларусі, і ў БССР камуністычныя партыі КПЗБ і КП(б)Б, праводзячы нацыянальную палітыку, дасягнулі вялізарных посьпехаў—КПЗБ у падрыхтоўцы мас да баёў за Кастрычнік. КП(б)Б—у замацаваньні дыктатуры пралетарыяту.

Адным з асноўных пытаньняў у нацыянальнай палітыцы зьяўляюцца пытаньні мовы. Прапаганда ідэй камунізму, ідэй Маркса-Леніна на роднай мове, на мове шырокіх мас, паскарае працэс аўладаньня масамі гэтых ідэй. Не дарма-ж ворагі рэвалюцыі вялі і вядуць барацьбу з камуністамі на гэтым вучастку, яны ўсялякімі спосабамі імкнуцца засьмеціць мову старым слоўным хламам, выступаючы супроць усяго новага ў мове, што нясе рэвалюцыйная барацьба. Чым больш завастраюцца клясавыя супярэчнасьці, тым больш шалёна мракабесы капіталу б'юцца за свае пазыцыі і ў пытаньнях мовы, скарыстоўваючы ўсё ўменьне ашукваць масы ў скрытай форме і зварачаючыся да манэўраваньня ў сваім лягеры, з мэтай адцягнуць увагу мас ад непасрэднай барацьбы.

У Заходняй Беларусі за апошнія часы на старонках беларускага нацыянал-фашысцкага друку пачалася палеміка па пытаньнях мовы паміж двума агентамі польскай акупацыі, нагромшчыкамі беларускага нацыянальнага вызваленчага руху **Янкам Станкевічам і А. Луцкевічам.**

Перш, Янка Станкевіч, кормячыся хлебам акупантаў, усямерна стараецца ўбіцца ў большую іх ласку, апякуноў. Гэты самы Янка Станкевіч праслыў калечаньнем мовы праз увядзеньне сьмеху вартых архаізмаў, правядзеньнем правапісу і фанэтыкі беларускай мовы часоў панчышны і фэадалізму. Робіць ён гэта пад лёзунгам «захаваньня самабытнасьці» мовы ў процівагу абноўленаму за часы рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР лексыкону працоўных мас. Бравы нацыянал-фашыст Янка Станкевіч выконвае заказ польскага імпэрыялізму і беларускай буржуазіі на грунце ідэалёгічным.

Яго «дзівосы» і скажэньні ў галіне мовазнаўства зьяўляюцца складанай часткай усёй яго контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці, накіраванай на задушэньне рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху супроць працоўных мас Заходняй Беларусі, на панаваньне польскай імпэрыялістычнай акупацыі і па БССР. Праз гэту «самабытнасьць» мовы, якую (самабытнасьць) так старанна фарсавалі і нацыянал-дэмакраты ў БССР, Янка Станкевіч і К-о ідэалізуюць беларускую старыну —росквіт беларускай буржуазнай дзяржаўнасьці, хочуць адвесьці ўвагу мас ад рэвалюцыйнай барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, ад барацьбы за рабоча-сялянскую Савецкую Беларусь.

Для беларускіх нацыянал-фашыстаў, як ідэолёгаў беларускай буржуазіі і кулацтва, вялікі не да ўспадобы наватворы, уведзеныя ў мову самімі масамі, наватворы, якія адбіваюць клясавую барацьбу ў беларускім народзе, адбіваюць перамогу беларускіх працоўных мас над кучкай сваіх і чужых эксплёататараў. Гэтыя наватворы, якія зьяўляюцца па сутнасьці разьвіцьцём беларускай мовы, нацыянал-фашысты і нацыянал-дэмакраты спатыкаюць у штыхі, называючы іх русыцызмам, засьмечаньнем і калечаньнем мовы.

Ня гледзячы на тое, што, напрыклад, слова «Саветы» стала сярод шы-

русі так блізкім, зразумелым і завявала права грамадзянства, як слова хлеб, воля, навстра,—нацыянал-фашысты ўпарта ўжываюць «рады», «радавая Беларусь» і г. д. Побач з тым, яны ахвотна поўнай жменяй густа расьсяваюць налёнізмы ў мове, і, апраўдваючы гэта «гістарычнай сваяцкай місіяй польскага і беларускага народаў», фактычна замацоўваюць капіталістычна - абшарніцкую польскую акупацыю Заходняй Беларусі і садзейнічаюць фашызацыі працоўных мас.

Усе гэтыя заслугі «філёлёга» Янкі Станкевіча ў здрадзе беларускага народу выклікалі асаблівую прыхільнасьць з боку польскіх фашысцкіх улад, якія адобрылі пана «навуковага» ласкамі і прывілеямі. Я. Станкевіч дапушчан да выкладаньня беларускай мовы ў Варшаўскім і Віленскім унівэрсытэтах і ў Віленскай духоўнай сэмінарыі. Разам з тым ён атрымлівае асабістую падачку ад ураду на выданьне часопісі «Родная мова». Цікава між іншым тая акалічнасьць, што пан Янка Станкевіч на кожным нумары часопісі не сароміцца пісаць, што часопісь «Выходзіць з памогаю міністэрства Вераў і Асьветы». І ня дзіва! Пад маркай міністэрства вераў і асьветы заўсёды зьбіраліся слаўныя арлы культуры ад дэфэнзывы. Янка Станкевіч толькі самавызначаўся.

У нумары шостым за 1931 г. «шаноўны» лінгвіст ад фашызму ў артыкуле «Слоўнічак» дае шмат вучоных доказаў супроць наватвораў у мове. У Станкевіча замест «блізна» —«порце», замест «уласнасьць»—«собственность», замест «чытач»—«читар», замест «тэлефон»—«слухалка» і г. д. Той-жа Станкевіч пад шыльдаю Брачыслаў Скарыпіч у гэтым фашысцкім сьвістку («Родная мова») ўзводзіць агідны паклёп на слаўнага рэвалюцыянэра Заходняй Беларусі Тарашкевіча, «рэфармуе» яго граматыку і «практыкуецца» ў сваіх лінгвістычных выкрутасах. Абвінавачваючы Бр. Тарашкевіча ў маскалізме, Скарыпіч «выкрывае гэтую здраду» Тарашкевіча такім прыкладам—замест «бядняк» мае быць па Скарыпічу «безны (або галева)» замест «прачка»—«мыцьцёха», прыказку «пайшла каса на камень» дыфэнзыўны лінгвіст лічыць агідным прыкладам здрады (!) Тарашкевіча і прапануе замяніць яе «крыўскай»—«чорт на паганага папаў» і г. д., і г. д.

У кожным новым слове «лінгвісты» Станкевічы бачаць здраду беларускаму руху, прыгнечаньне мовы з боку камуністаў і кажуць проста: «Як раней царскі ўрад, так цяпер камуністычны вядуць абрусеньне беларускага народу» (стар. 182, «Родная мова»). Такім чынам у нацыянал-фашыстаў кожны наватвор мас, які ўзбагачвае, спрашчае мову,—або «здрада», або «абрусеньне беларускага народу».

Канкурэнцыя за больш ласы кавалак з рук польскіх панаў і заскокі пана Станкевіча выклікалі ў беларускага обор-фашыста Луцкевіча публіцыстычны зуд. Ён на шпаргалках сваёй газэціны выступіў з абурэньнем супроць «анархізаваньня нашай мовы» і стаўны ў рыцарскую позу, заклікае да «абароны і ўдасканаленьня беларускай мовы».

«Гэта ёсьць першая і **галоўная задача** нашага асьветнага грамадзянства»—бубніць «Беларускі звон» Луцкевіча, імкнучыся адцягнуць увагу працоўных мас ад іх **галоўнай задачы**—барацьбы супроць фашысцкага ўраду акупацыі, голаду, шыбеніц і вайны. Луцкевіч прайшоў вялікую контр-рэвалюцыйную правакатарскую школу і таму, ён выяўляе большую манэўраздольнасьць у ашуканстве мас, ён разумее, што нясур'ёзныя архаізмы Станкевіча зьяўляюцца лішняй перашкодай у падыходзе да мас, каб сярод іх праводзіць сваю здрадніцкую фашысцкую работу. Ён разумее, што пры тэй паглыбленай дыфэрэнцыяцыі і завастрэньні клясавай барацьбы на ЗБ, пры існаваньні БССР, ужо не пасуе перасольваць у ідэалізацыі Крывіі Ластоўскага, і таму, «лаючы» Станкевіча, ласьліва раіць «усім тым высокім установам, якія ўсьцяж абдараюць яго сваім давер'ям», мець меру ў контр-рэвалюцыйнай крутусе на ідэалёгічным фронце, бо гэта шкодзіць іх агульным буржуазным мэтам.

Прыцідваючыся абаронцам беларускай мовы, Луцкевічу, Астроўскаму і беларускай хадэцыі зусім не перашкаджае канфэраваць з прадстаўнікамі фашысцкага ўраду і школьных урад над зьменай беларускай арфаграфіі, над увядзеньнем польскага шрыфту, над апрацоўкай калёнізаторскіх школьных падручнікаў і гэтым дапамагаць акупантам гвалтам апалячываць і фашызаваць беларускія працоўныя масы.

Новы школьны статут, які ня толькі ідзе далей на лініі ўзмацненьня палёнізацыі, але і павялічвае анальфабэтызм сярод працоўных мас, перад якім блядненюць царскія драконаўскія законы, беларускія нацыянал-фашысты прынялі прыхільна і з захвалай. Астроўскі на адной з такіх канфэрэнцый назваў гэты статут справядлівым і шматабяцаючым, а «Беларускі звон» у сваёй пералавіцы называе яго новай эпохай у беларускім школьніцтве.

Беларускія нацыянал-фашысты актыўныя і заслужоныя дапаможнікі фашызму ў барацьбе супроць нацыянальна-вызваленчага руху на Заходняй Беларусі, у разгроме і фашызацыі ТБШ. Праз іх правакацыю і пры іх удзеле кінуты на доўгія гады ў вастроті тысячы і тысячы барацьбітоў за вызваленьне з-пад акупацыі, у тым ліку паслы Грамады і «Змаганьня» і лепшыя барацьбіты з ТБШ. Пры іх удзеле разагнаны быў шматлюдны Заходня-Беларускі зьезд ТБШ у Вільні 12 красавіка, праведзены масавыя арышты сярод дэлегатаў і цэлер па загаду ваяводы Бечковіча створана фіктыўная галоўная ўправа ТБШ, каб кіраючыся на паліцэйскія штыхі і праз юдавы срэбнікі гэта ўправа магла выкарыстаць рабоча-сялянскую масавую арганізацыю для контр-рэвалюцыйных імпэрыялістычных мэт польскага фашызму.

Паны нацыянал-фашысты махаюць бутафорскімі мячамі ў абарону чыстаты беларускай мовы, у той час, калі польскі акупант вядзе яшчэ нябывалае на Беларусі па сваёй нахабнасьці нацыянальнае прыгнечаньне. Гэту акупацкую работу фашысцкі ўрад праводзіць шляхам прасьледаваньня беларускай мовы, школы, газэт, масавых арганізацый і, побач з тым, шляхам заснаваньня сваіх палёнізатарскіх фашысцкіх арганізацый, а таксама праз польскую школу, касьцёл, дзяржаўны апарат, асадніцтва, калёнізацыю, прэсу, армію і інш.

За 13 год акупацыі мы бачым, як далёка пайшоў урад у справе «ўкараненьня польскасьці і замацаваньня польскай насялёнасьці» на Зах. Беларусі, у справе выкарчаваньня ўсяго нацыянальнага, беларускага, якое процістаўляецца палёнізацыі, змагаецца за правы беларускага народу на самавызначэньне аж да аддзяленьня.

Галоўны агонь акупанты накіроўваюць на беларускую школу. Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі працоўныя масы, узрушаныя клясавай барацьбой, адначасова ўзбудзілі і сваю нацыянальную сьвядомасьць, пачуцьцё ўзяліся за будову школ на роднай мове. У пачатку польскай акупацыі на Зах. Беларусі было да 400 школ. Аднак, з працягам узмацненьня акупацыі паны пачалі гвалтам закрываць беларускія школы. У працягу кароткага часу засталося некалькі дзесяткаў школ, настаўнікаў распарушылі

Каапэрацыйныя арганізацыі яшчэ ня рыхтуюцца па-баявому да гароднага сэзону 1932 г.

Рост спэцыялізаваных калгасных і саўгасных гаспадарак, пашырэньне пасеўнай плошчы пад гароднінай, разгорт ваньне сеткі прыгарадных гаспадарак — усё гэта стварае магчымасьць поўнага задаваленьня патрэб працоўных у плодагародных прадуктах.

Задача заключаецца ў тым, каб правесьці як сьлед кантрактацыю, загатоўкі і забясьпечыць хаваньне і пераапрацоўку плодагароднины.

Як рыхтуюцца каапэрацыйныя, калгасныя і саўгасныя арганізацыі да правядзеньня гэтай работы?

23 красавіка пры рэдакцыі «Зьвязда» адбылася нарада прадстаўнікоў зацікаўленых установаў па пытаньні аб падрыхтоўцы да гароднага сэзону 1932 г. Выступленьні і інфармацыі цэлага раду таварышоў даюць магчымасьць меркаваць аб становішчы работы па гэтым участку.

Перш за ўсё аб раньняй гародніне. Паводле пляну Белплодагародкалгассаюзу было намечана закласьці пад раньнюю гародніну 4.405 парніковых рам, пад рассаду — 21.243 рамы. Фактычна-ж закладзена ўсяго 7.473 рамы, што складае 23,1 проц. У раёнах МТС павінна быць закладзена 60.000 парніковых рам. Плян выканан на 90,85 проц.

Прадстаўнік Белплодагародкалгассаюзу тав. **Стэрнэ** невыкананьне пляну закладкі парніковых рам тлумачыў розныміі «аб'ектыўнымі» прычынамі. Ён спасылаўся на недахват шкла і іншых матар'ялаў. Зразумела, гэта не матыў. Стэрнэ ня мог прывесьці ні аднаго факту, калі-б райкалгассаюз, ці калгас зьвярнуўся за дапамогай да ЗРК, з якім заключан дагавор на продаж прадукцыі. З другога боку і каапэрацыйныя прафсаюзныя арганізацыі прамысловых гарадоў не правялі патрэбнай работы, каб мабілізаваць унутраныя рэсурсы (брак шкла, адкіды будматар'ялаў) і дапамагчы асобным калгасам выканаць плян закладкі парніковых рам. Гэта, аднак, ні ў якой меры **не памяншае** віны самога Белплодагародкалгассаюзу, які ў пытаньнях барацьбы за раньнюю плодагародніну **правяў непаваротлівасьць і марудна**сьць.

Не праяўляе патрэбнай гібкасьці Белплодагародкалгассаюз і ў арганізацыі сяўбы, падрыхтоўцы хавальняў для позьняй гародніны.

Калі ў мінулым годзе па калгаснай сыстэме было занята пад гароднінай 8.800 га, дык у гэтым годзе павінна быць засеяна ня менш 15.000 га. Каб поўнасьцю асвоіць гэту плошчу патрэбна вялікая колькасьць насеньня. Тав. Стэрнэ на нарадзе прывёў, як дасягненьне, што насеньнем бручкі, намідораў і позьняй капусты гаспадаркі забясьпечаны поўнасьцю. Аднак, высьвятляецца, што капустай забясьпечаны ўсяго толькі на 68 проц., а раньняй бульбай толькі на 20,9 проц. Гэта значыць, што плян па засеве раньняй бульбы настаўлен пад пагрозу зрыву. Дапусьціць недасеву **нельга.** Калгаснай сыстэме трэба правяць максымум энэргіі і паваротлівасьці, каб забясьпечыць поўнае выкананьне пляну.

Позьнім бульбяным насеньнем гаспадаркі Белплодагародкалгассаюзу забясьпечаны на 72,1 проц., гуркамі — на 31,3 проц., сталовымі буракамі — на 18 проц., морквай — на 29,2 проц., гатунковай бульбай зусім не забясьпечаны. І тут становішча далёка ня бліскучае.

Поўнае выкананьне пляну будзе гарантавана толькі тады, калі да канца вытруціць апартуністычнае заспакаеньне, самацёк, калі сыстэма калгассаюзу па-сапраднаму возьмецца за мабілізацыю насенных рэсурсаў асабліва па дэфіцытных культурах. Шляхі для вырашэньня гэтай задачы, паказвае **вопыт соцень перадавых калгасаў БССР і ўсяго Саюзу.**

Для захаваньня гароднины па больш доўгі час Белплодагародкалгассаюз мяркуе пабудаваць на месцы ў гаспадарках 2 квасільных пункты ёмкасьцю ў 500 тон капусты, 2 гурковазасолачных пункты на 400 тон. Мяркуецца таксама пабудаваць 256 бульба-хавальнікаў на 25.600 тон, 20 цыбуля-хавальнікаў на 1.000 тон. Але гэта толькі мяркуецца. **Пакуль што да пабудовы не прыступілі.**

Маруднасьць у такой важнейшай справе, асабліва ўлічваючы вопыт мінулага году (калі шмат гароднины згніло), нічым апраўдаць нельга.

Ці можна прызнаць колькі-небудзь сур'ёзнай прычыну, што ў калгасах ня хопіць (?) рабочай сілы? Спасыланьне на недахоп матар'ялаў таксама ў даным выпадку зьяўляецца штучна-змайстраваным «аб'ектыўнай» прычынай, бо для хавальнікаў не патрэбна высокай якасьці будматар'ялаў.

Замест работы--спрэчкі

Згодна пастаноў ураду асноўнымі арганізацыямі, што павінны праводзіць кантрактацыю гароднины, зьяўляюцца Белплодагародніна і Белкаапплодагародніна. Паміж гэтымі арганізацыямі разьмеркаваны зоны, у якіх яны павінны праводзіць кантрактацыю і загатоўку.

Белплодагародніна павінна закантрактаваць 45 проц. ураджаю яблык. Белкаапплодагародніна — 55 проц. Адпаведна па гароднине першая арганізацыя 40 проц. і другая — 60 проц.

Задачы перад абедзьвюма арганізацыямі аднолькавыя. Мэта таксама — выканаць намечаныя пляны кантрактацыі з тым, каб забясьпечыць гароднінай працоўнага спажыўца.

Аднак, гэтыя дзьве арганізацыі **ня могуць як сьлед дагаварыцца,** спрачаюцца, скочваючыся ў асобных выпадках да канкурэнцыі.

Нездаровыя ўзаемаадносіны ня рэдка вырастаюць на глебе няправільных дзеяньняў мясцовых арганізацый. Так, напрыклад, у Аршанскім раёне Белплодагародніна павінна кантрактаваць 50 проц. усёй прадукцыі, але раённыя арганізацыі дазваляюць толькі 8 проц., астатнія-ж пакідаюць за спажывецкай каапэрацыяй. У Слуцкім раёне Белплодагародніна павінна закантрактаваць 50 проц., а райарганізацыі дазваляюць толькі 12 проц. Такое-ж становішча ў Жлобінскім, Койданаўскім і іншых раёнах. Відавочна, што ў такіх выпадках раённыя арганізацыі ставяць на першы плян свае месьцовіцкія інтарэсы.

Не ўрэгулявана таксама пытаньне з загатоўкай ягад. Белкаапплодагародніна праводзіць кантрактацыю ягадных культур, ня маючы для гэтага выстарчальнай колькасьці тары, пераапрацоўчых пунктаў і патрэбных матар'ялаў. Белплодагародніна мае тару, патрэбныя матар'ялы і да таго-ж вопыт работы. Адсюль і пачынаюцца спрэчкі.

— Дайце нам тару—гаворыць Белкаапплодагародніна.

— Не, вы нам аддайце ягадныя раёны—спрачаецца Белплодагародніна.

— У вас пагніюць ягады, вы ня зможаце іх пераапрацаваць — гаворыць адны. А ў вас згніе тара — адказваюць другія.

Пара спыніць гэтыя нікому непатрэбныя спрэчкі. Абедзьве арганізацыі павінны ўзяцца па-дзелавому за падрыхтоўку да загатовак і пераапрацоўкі ягад.

Будаўніцтва пакуль што ў праекце..

Забясьпечанасьць гароднінай прамысловых цэнтраў залежыць ня толькі ад пасьпяховай кантрактацыі загатовак, але ў вялікай меры ад падрыхтаванасьці гароднін-хавальнікаў і пераапрацоўчых пунктаў. Вось да гэтым пытаньні і прадстаўніку Белкаапплодагароднины тав. **Зелічонку** і Белплодагароднины тав. **Хавічу** сказаць ня было чаго, апрача пэрспэктыў.

На будаўніцтва хавальнікаў і квасільных пунктаў складзены пляны, а больш гэтага нічога ня зроблена. У Белплодагароднины ёсьць дрова і не хапае жалеза, а ў Белкаапплодагароднины наадварот—ёсьць жалеза, не хапае дрова.

Дзейсных мер, каб дастаць патрэбны матар'ял ні тая, ні другая арганізацыя не праяўляюць. Больш таго, гэтыя арганізацыі да сёнешняга дня не заключылі дагавор з Каапбудам для правядзеньня будаўніцтва.

Налаўнасьць у адным арганізацыі жалеза, а ў другой дрэва-матар'ялаў гаворыць аб тым, што пры поўнай настойлівасьці і паваротлівасьці як той, так і другі матар'ял дастаць можна.

Такім чынам у падрыхтоўцы да гароднага сэзону ва ўсіх напрамках шмат прабелаў, шмат буйнейшых недахопаў.

На ліквідацыю гэтых недахопаў і прабелаў павінны быць па-сапраўднаму мабілізаваны сілы каапэрацыйных, прафсаюзных арганізацый, калгаснай і саўгаснай сыстэмы і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Кантрактацыя--важнейшы этап барацьбы за гароднину

Разам з тым **асаблівую ўвагу трэба аддаць правядзеньню кантрактацыі, як важнейшаму на сёнешні дзень этапу барацьбы за плодагародніну.**

Інэртнасьць некаторых загатоўчых арганізацый, спазьненьне з рассылкай пляцаў, невыстарчальна разгорнутая масавая работа прывялі да таго, што процант кантрактацыі асноўных гародных культур надзвычай нізкі. Так, Белплодагароднінай закантрактавана бульбы 29,2 проц., гароднины — 60 проц., фруктаў — 69,3 проц. Белкаапплодагароднінай закантрактавана бульбы — 40,4 проц., капусты — 97,7 проц., буракоў — 89,2 проц., гуркоў — 63,2 проц., фруктаў — 77,3 проц. і г. д. Нездавальняючая работа ў колькасных адносінах у радзе месц суправаджаецца нізкай якасьцю кантрактацыі. У прыватнасьці асобныя работнікі практыкуюць заключэньне дагавораў казённым канцылярскім спосабам, абыходзячы агульныя сходы калгаснікаў.

Пасьпяховае правядзеньне гароднага сэзону ва многім залежыць ад таго, як будзе праведзена кантрактацыя. Таму гэты вучастак, як і другія этапы работы (сяўба, поліва, уборка, перавозка, пераапрацоўка і хаваньне) павінны быць узяты пад штодзённы нагляд і ўзмоцненае кіраўніцтва партыйных арганізацый.

АДКРЫЦЬЦЁ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ КОЙДАНАУШЧЫНЫ

ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ АДЗНАЧАЮЦЬ ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ ТВОРЧАЙ ЭНЭРГІІ, УЗМАЦНЕНЬНЕМ ТЭМПАЎ СЯЎБЫ, ВЫКАНАНЬНЕМ ПАЛІТЫЧНА-ГАСПАДАРЧЫХ ЗАДАЧ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД РАЁНАМ

ПРЫВІТАНЬНЕ СТАРШЫНІ ЦКК-НК РСІ УССР т. ЗАТОНСКАГА

Шчыра вітаю новы фарпост польскай сацыялістычнай культуры

ЗАТОНСКІ.

Прывітаньне кіеўскага польскага пэдагагічнага інстытуту

Польскі інстытут садзьбыху шле палкае прывітаньне працоўным масам польскага нацыянальнага раёну БССР. Жадаем новаму фарпосту польскай пралетарскай культуры посьпеху ў арганізацыі сацыялістычнай гаспадаркі. Інстытут дае абавязацельствы ўсебакова дапамагаць польскаму нацыянальнаму раёну. Інстытут пасылае выпуск студэнтаў на пасталянную работу ў Койданава.

Няхай жыве Койданаўскі польскі раён — баявы фарпост сацыялістычнага кардону.

Дырэктар Кіеўскага польскага пэдагагічнага інстытуту САХАЦКІ.

Падарунак надзвычайнаму зьезду

У падарунак надзвычайнаму зьезду саветаў Койданаўскага нацыянальнага раёну калгаснікі «Ударніка», Дабрынеўскага сельсавету, арганізавалі чырвоны абоз і сёньня здалі ў Койданаве 800 кгр. пшаніцы.

Рабочыя саўгасаў і калгаснікі сустракаюць раённы зьезд саветаў з энтузіязмам

КОЙДАНАВА, 27. У сувязі з адчыненьнем надзвычайнага зьезду саветаў Койданаўскага нацыянальнага польскага раёну партыйныя і савецкія арганізацыі разгарнулі шырокую арганізацыйна-масавую работу па выкананьні чарговых гаспадарча-палітычных задач, па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і датэрміновым скончэньні веснавой сяўбы.

У саўгасы і калгасы паслана звыш 50 чалавек раённага, партыйнага і савецкага актыву. Заключан саццагавор паміж Койданаўскім і Заслаўскім раёнамі па лепшае правядзеньне сяўбы і паміж Койданаўскім і Вузьдзенскім раёнамі па датэрміновае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў у другім квартале. Выклікан на сапспаборніцтва Мархлеўскі нацыянальны польскі

Рабочыя саўгасаў і калгаснікі суседзяў УССР.

стракаюць раённы зьезд саветаў з вялікім энтузіязмам. На сёнешні дзень выехаў у поле 51 калгас. Саўгас «Негарэлае» ўжо засеяў 110 га збожжавых культур, калгас «9 студзеня» — 50 га. «Ударнік № 2»—17 га, «Чырвоны сьцяг»—19 га і г. д. Калгаснікі бяруць на сябе абавязак сяўбу закончыць датэрмінова.

У раёне шырока разгарнулася мабілізацыя ўнутраных і насенных рэсурсаў. Ударніца калгасу імя СНК БССР Сьвядовіч Марыля першая ў сваім калгасе набыла аблігацыі насеннай пазыкі імя конкурсу «Правды» на 1.060 кгр. бульбы. У падарунак зьезду саветаў калгаснікі арганізоўваюць чырвоныя абозы. Так, калгас «Ударнік» арганізаваў чырвоны абоз у колькасьці 50 пуд. пшаніцы і адкормленага каба ніз, калгас «Трудавік»—40 пуд. збожжа, цялят і сьвіней. Па саўгасах «Вязынь»—«Фінапаль» у гонар зьезду датэрмінова пабудован дом камуны на 100 чал., у саўгасе «Негарэлае» — 2 сьвінарнікі, саўгасе «Шыкатовічы» — сталовая і 4 сьвінарнікі. Райспажыўсаюз выкажаў плян паянакаплення ІІ кварталу на 54 проц. (Белта).

Калгаснікі выкрываюць кулацкія манэўры

Перавыбарчая кампанія па Лахавіцкім польскім нацыянальным сельсавеце прайшла пад лёзунгам лепшай падрыхтоўкі і правядзеньня трэцяй бальшавіцкай вясны.

Перад арганізацыйным пленумам сельсавету для яго лепшай падрыхтоўкі 17 красавіка адбыўся зьлёт старшынь і членаў праўленьняў калгасаў, якіх у сельсавеце налічваецца 12. Зьлёт абвясьціў сябе ўдарным на правядзеньні трэцяй бальшавіцкай вясны і пастанавіў занесьці на чорную дошку старшынь калгасу «Узвышша» Чыжэўскага Д. і «Чырвонае возера»—Ждановіча А., за дрэнную падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

На зьлёце калгасы заключылі паміж сабой дагавары на сапспаборніцтва. Калгас імя Варашылава заключыў дагавор на сапспаборніцтва з калгасам «Камуніст» і інш. Больш моцныя калгасы: імя Варашылава, імя Крупскай і іншыя ўзялі на буксір адстаючыя калгасы «Узвышша», «Чырвонае возера» і інш.

Узятыя самаабавязацельствы калгасамі на зьлёце—выехаць да арганізацыйнага пленуму сельсавету ў поле — выконваюцца. Так, да 20 красавіка, да часу арганізацыйнага пленуму сельсавету, рад калгасаў выехаў у поле.

Напярэдадні ідзе калгас імя Крупскай, які засеяў 2,5 гэкт. сэрадэлы, 8 гэкт. аўса і 6 гэкт. пшаніцы. Калгас за добрую падрыхтоўку да сяўбы атрымаў ад райвыканкому 200 руб. прэміі. Старшыня калгасу тав. Баўтручок атрымаў пэрсональную грашовую прэмію ў 100 руб. Калгас абавязаўся дапамагчы ў правядзеньні сяўбы калгасу «Расьсьвет».

Калгас імя К. Маркса за два дні вывез на поле гною на 8 гэкт. Гэта зямля падрыхтавана ўжо для пасеву бульбы. Калгас «Камуніст» падрыхтаваў за два дні для пасеву 9,5 гэкт. зямлі. Калгас «Новы сьвет» падрыхтаваў для засеву 15 гэкт. і г. д.

Клясавы вораг скарыстоўвае асобных калгаснікаў для разлажэньня калгасаў. Так, старшыня калгасу «Узвышша» — Чыжэрскі Д., цяпер зьняты, агітаваў калгаснікаў, каб яны выяжджалі на свае палоскі, раздаваў корм нават тым калгаснікам, якія зусім не працавалі.

У калгасе імя Крупскай заможнікі імкнуліся сарваць сход беднаты, які абгаварваў кандыдатуры ў сельсавет. Яны напіліся і напаілі некаторых беднякоў, але сарваць сход не ўдалося, бо калгаснікі далі ім рашучы адпор. У калгасе «Вясёлы вугал» заможнікі выстаўлялі ў сельсавет канцы датуру заможніка Янушкевіча, які пралез у калгас і разлагаў яго і які зараз асуджан нарсудам на 5 год пазбаўленьня волі. Разам з Янушкевічам вёў разлагаючую работу Ключка, які разлажыў аддзяленьне Студзянка, дзе ён быў загадчыкам і першым разабраў інвэнтар. Як цяпер высьвятлілася, Ключко — былы ольскі легіянэр.

Гэтыя выдумкі клясавага ворага былі выкрытыя калгаснікамі пад кіраўніцтвам райпартарганізацыі, ім быў дан руйнуючы адпор.

Арганізацыйны пленум сельсавету, які адбыўся 20 красавіка завастрыў увагу ўсяго актыву і калгаснікаў на выкананьні задач трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Старшынёй сельсавету выбран рабочы. Склад сельсавету абнавіўся на 86 проц., бо стары склад яго ня ўзяў належных тэмпаў у рабоце. Досыць адзначыць, што ў справе мабілізацыі сродкаў аднаразовы культзбор выкапан толькі на 50 проц.

М. С.

Камунальнае будаўніцтва

Мабілізацыяй унутраных рэсурсаў пакрыць недахват у матар'ялах

НЯ ЎВОЗІЦЬ З АДЭСЫ ТАГО, ШТО ЁСЬЦЬ У ПЛЕШЧАНІЦАХ

Жыльлёвае будаўніцтва ў Менску разгортваецца недапушчальна марудным тэмпамі. Мяркуючы па дакладах кіраўнікоў Белбудканторы і Менбуду на пасяджэньні камісіі садзейнасьці камунальнаму будаўніцтву, асноўная прычына адставаньня хаваецца ў невыстарчальным забясьпячэньні будаўнічымі матар'ямі.

Белбудкантора да апошняга часу не магла закончыць пабудовы 10 дамоў з-за недахвату цэглы. Таксама не хапае цьвікоў. Няма чым канчаць. У 112 кватэрным доме замест 56 кватэр да 1 мая будзе гатова толькі 40.

Такі-ж прыблізна малюнак намалёўваў на пасяджэньні камісіі садзейнасьці пры «Зьвязьдзе» прадстаўнік Менбуду. З-за недахвату дробных цьвікоў здача 6 дамоў спозьніцца на 10 дзён (замест 1 мая яны будуць зданы толькі 10). Нехапае піламатар'ялу. Галоўдартранс, які абавязан забясьпечыць пабудову свайго дому матар'ямі, не дае амаль нічога.

Трэба сказаць, што значная частка віны за недахват матар'ялаў падае на будуючыя і будаўнічыя арганізацыі. У спрэчках было расказана шмат фактаў, якія сьведчаць аб наяўнасьці раду няўвязак і непаладак у разьмеркаваньні матар'ялаў, у іх выдаткаваньні, асабліва ў справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Ёсьць арганізацыі, якія паводле пляну павінны пачаць будаўнічыя работы ў канцы другога кварталу, у трэцім, або ў пачатку 1933 году. Але гэтыя арганізацыі так ці інакш запасьліся ўжо часткова матар'ямі. У некаторых ёсьць вялікія рэшткі пасьля будоўлі. Усё гэта хаваецца «на ўсякі выпадак».

Толькі гэтымі днямі будсэктар Дзяржпляну знайшоў магчымым забраць у Белпрамхлебе і перадаць Белбудканторы 25 тыс. цаглін.

Гэты факт сыгналізуе адначасова аб тым, што фонды будматар'ялаў разьмяркоўваюцца часам без належнага ўліку сапраўднай патрэбнасьці данай арганізацыі ў матар'ялах. Няма сумненьня, што **масавае абсьледваньне складаў і будаўнічых пляцовак** выявіла-б яя мала лішкаў усякага дабра, якія вельмі патрэбны першачарговым будоўлям.

Зусім невыстарчальна вывучаны і ўлічаны магчымасьці мясцовай прамысловасьці будматар'ялаў. У «Зьвязьдзе» ўж о асьвятляўся анэкдатычны факт аб керамічных трубах, якія ўвозіліся з-пад Ленінграду, у той час, як копыскія кахляныя заводы адпраўлялі такія-ж трубы ў Маскву.

Па пасяджэньні камісіі садзейнасьці выявіўся аналёгічны факт. Аказваецца, некаторыя бударганізацыі ўвозяць вапну з Адэсы і пераплачваюць тысячы рублёў у той час, як у Койданаве, Плешчаніцах і іншых мясцох ёсьць вапнавыя заводы, дзе выраб вапны можна-б значна пашырыць.



Будаўніцтва стандартных дамоў у пасёлку Кампітэрн. Выгляд доміка праз 10 гадзін пасьля пачатку будаўніцтва. 4 кватэры ніжняга паверху ўжо гатовы.

Пытаньне эканоміі будматар'ялу підзе амаль ня ставіцца сур'ёзна. Калі па прадпрыемствах барацьба за эканомію матар'ялаў вядзецца ў кожнай брыгадзе, асабліва ў гаспадарча-разрахунковых, дык на пабудовах гэта работа знаходзіцца яшчэ ў пачатку і **гаспадарча-разрахунковыя брыгады** налічваюцца пакуль што **адзінкамі.** Эканомія матар'ялаў, замена вострадэфіцытных менш дэфіцытнымі, вынаходзтва і рацыяналізацыя ў гэтай галіне, ажыцьцяўленьне сапраўднага гаспадарчага разрахунку—павінны стаць **дадатковай крыніцай пакрыцьця недахвату ў будматар'ялах.**

На жаль, гаспадарчы разрахунак, як правільна ўказаў тав. **Раззнгауз,** яшчэ чужы некаторым бударганізацыям. Скрозь і ўсюды бударганізацыі выходзяць з лімітаў, пераплачваюць на кожнай дробязі, кідаюць грошы направа і налева, а потым прымушаны згортваць будаўніцтва з-за датэрміновага выдаткаваньня грашовых асыгнаваньняў.

Гэта-ж агідна**сьць, калі** кошт стандартнага доміка складае 32 тыс. руб., г. зн. амаль столькі-ж, колькі камяніца такой-жа плошчы.

Ударыць па рвацкіх тэндэнцыях, на безгаспадарчасьці, пакончыць з безадказнасьцю ў адносінах выдаткаваньня ня лімітных фондаў—асноўная задача будаўнічых арганізацый і пралетарскай грамадзкасьці.

Камісія садзейнасьці выказалася за тое, каб закончыць дагаворную кампанію не пазьней 1 мая, паставіць пытаньне перад Дзяржпляном аб выдачэньні дадатковых фондаў будматар'ялаў, асабліва на рамонты старога жыльлёвага фонду, дапамагчы прадпрыемствам і ўстановам аформіць практычнае шэфства над будаўнічымі аб'ектамі, разгарнуць шырокую кампанію за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў будматар'ялаў.

УЛЬТЫМАТУМ ЗОТАВА

«Машына - зьнішчальная станцыя» адна назва чаго варта!) купіла ў прыватніка дом на Барысаўскім тракце № 19 для пашырэньня сваёй установы і прынялася выжываць жыхара гэтага дому — галоўнага інжэнэра брадзільнага аб'яднаньня тав. Абрамовіча. І паколькі проста выкінуць яго з сям'ёй станцыя ня мае права, дык дырэктар не тав. **Зотаў** паслаў 25 красавіка інжэнэру ультыматум, каб ён не пазьней 3 мая аслабаніў пакой.

Адначасова, ведаючы, што ў інжэнэра Абрамовіча іншай кватэры няма і наўрад ці ён аслабаніць пакой, «машына - зьнішчальная станцыя», маючы вялікі вопыт у зьнішчэньні ўсякіх шкоднікаў сельскай гаспадаркі, пачала ламаць сьцены, каб прымусіць інжэнэра вызваліць пакой.

Калі старшыня мясцкому і старшыня бюро ІТС брадзільнага аб'яднаньня зьвярнуліся да тав. Зотава, апошні іх абазваў «фактарамі» і заявіў, што ім няма чаго хадзіць на такіх справах. А тэхнарук станцыі тут -жа дадаў—«дайце нам гэтага інжэнэра і тады мы яму неадкладна дамо кватэру» і яшчэ — «калі - б ён быў рабочым, яму - б кватэру далі, а ІТР атрымліваюць вялікую пэнсію і могуць самі сабе купіць».

Адпаведныя органы павінны спыніць сьцёбкі кіраўнікоў «машыны-зьнішчальнай станцыі» з інжэнэра Абрамовіча і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто ігнаруе і скрыўляе дырэктывы партыі і ўраду аб паляпшэньні матар'яльна - бытавых умоў ІТР.

Сьведкі

АГЛЯД ДРУКУ

ЗА „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" І „УНІВЭРСАЛКУ"

„СЕЛЬМАШАЦ"—ГАЗЭТА ГОМСЕЛЬМАШУ

4-ты завяршаючы год пяцігодкі паставіў перад прамысловасьцю вялізарнейшыя задачы. Асабліва вялікія задачы пастаўлены перад машынабудаўніцтвам, якое тэхнічна пераўзброівае ўсю гаспадарку савецкай краіны.

Гомельскі завод с.-г. машын—адзін з буйнейшых заводаў Беларусі, абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі. Аднак, хваробы пуску зацягнуліся занадта доўга. Асноўныя прычыны—дрэнная арганізацыя працы, ураўнілаўка і абезьлічка па заводзе.

Бальшавіцкая барацьба за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна забясьпечыла заводу пералом у другой палове 1931 году. Завод выпаў па шляху ліквідацыі, усё больш і больш аўладваючы вышынямі тэхнікі.

У першым квартале 1932 году Гомсельмаш заняў першае месца сярод прадпрыемстваў мэталапрацоўчай прамысловасьці БССР, выканаўшы вытрымаўшы плян на 119,3 проц. Такім чынам, вопыт гэтага заводу яшчэ раз даказвае, што «рэальнасьць нашай праграмы—гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашучасьць выканаць плян» (Сталін).

Якую-ж ролю адыграла пяцігодка Гомсельмашу ў гэтай пераробцы? На гэта пытаньне даюць адказ нумары «Сельмашца» за студзень-сакавік 1932 году.

Яшчэ 12 студзеня «Сельмашац» у сваёй перадавой пісаў:

«...права рапартаваць XIV зьезду КП(б)Б і XVII канфэрэнцыі УсесКП(б) будзем мець тады, калі мы гэтае права здаваем упартай бальшэвіцкай барацьбой за прамфінплян».

Разгарнуўшы барацьбу за выкананьне прамфінпляну, газэта не абмежавалася агульнымі заклікам, а пачала прасоўваць заводзкі прамфінплян да цэху, брыгады, агрэгату. 4 лютага «Сельмашац» усю першую паласу прысьвячае прамфінпляну на 1932 год. Ня голымі лічбамі, а растлумачэньнем палітычнага сэнсу праграмнага заданьня газэта ўлывае на рабочыя масы.

Гомсельмаш, галоўным чынам, выпускае кормаапрацоўчыя машыны для жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў. Ужо адно гэта гаворыць аб тым, наколькі вялікая роля заводу ў стварэньні магутнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

На 1932 год Гомсельмаш атрымаў заданьне выпусьціць прадукцыі па 12.575.000 руб. У першым квартале завод павінен быў выпусьціць прадукцыі па 2.361.000 руб., або 18,2 проц. гадавога пляну. Параўнальна з 1931 г. плян 1932 году ўзрос па 61,4 проц. На 1 чалавека-гадзіну прадукцыйнасьць працы ўзрастае параўнальна з 1931 **г. на 19,5 проц.** Гэтыя некалькі лічбаў даволі пераканаўча гавораць аб неабходнасьці самай шырокай мабілізацыі і арганізацыі мас вакол выкананьня заданьняў на чацьверты, заключны год пяцігодкі.

«Сельмашац» 8 сакавіка дае на першай паласе распрацаваны ў дэталях прамфінплян, шырока папулярызуючы вытворчыя задачы кожнага цэху і брыгады.

Тое-ж самае зрабілі і цэхавыя і брыгадныя пасьцегазэты. «Сельмашац» дабіўся таго, што прамфінплян па 1932 год і яго першы квартал **быў даведзен да кожнай брыгады, да кожнага рабочага.**

Даведзеньне прамфінпляну на 1932 год супала з калдагаворнай кампаніяй. Газэта выкарыстоўвае гату кампанію для таго, каб яшчэ больш укараніць 6 умоў тав. Сталіна. Яна бярэ пад кантроль мас работу ТНВ, аддзел рацыяналізацыі, бухгальтэрыю, а яшчэ да таго яна арганізавала паход за рэалізацыю другой умовы тав. Сталіна аб палепшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых. У паходзе прымала ўдзел больш 100 рабочых, якія ня толькі правяралі работу ЗРК, магазынаў і сталовак, але дапамагалі палепшэньню іх работы. Паход паказаў, што

«...пры жаданьні і ўмелай рабоце, сац.-бытавыя ўмовы рабочых могуць быць палепшаны. Гэта справа павінна заняць адно з першых месц у барацьбе за выкананьне прамфінпляну... За час паходу адкрыт новы буфэт, пачаў працаваць стол ударнікаў, заключаны саццагавары паміж ЗРК, ліцейным і кавальным цэхамі на лепшае забясьпячэньне і пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Адкрыта мясная крама, арганізаваны тры гаспадарча-разрахунковыя брыгады ў магазыне, пачаў працаваць куток ударніка пры магазыне, адкрываецца парык ЗРК на заводзе. Палепшылася санітарнае становішча ў сталоўцы».

Станоўчым бокам «Сельмашца» зьяўляецца тое, што ён умее ўсе кампаніі, якія ён праводзіць, падпарадкаваць асноўнай мэце—выкананьню прамфінпляну. Так, праводзячы паход-спаборніцтва фабрычна-заводзкага друку, абвешчаны «Зьвяздой» і ЦСПСБ, «Сельмашац» супольна з цэхавымі і брыгаднымі пасьцегазэтамі разгарнуў барацьбу за датэрміновае выкананьне прамфінпляну першага кварталу. 8-га сакавіка газэта паведамляла, што

«...брыгада № 4 мэханічнага цэху перавыконвае сваё заданьне па прамфінпляну і эканоміць бабіт. Плян пры непасрэдным удзеле рэдкалегій выкананы па брыгадзе на 100 проц. Брыгада ўзяла на сябе абавязак дапамагчы ў выкананьні пляну дрэваапрацоўчаму цэху».

У канцы сакавіка газэта, падагульваючы першыя вынікі паходу спаборніцтва канстатуе, што лёзунг па датэрміновым выкананьні пляну першага кварталу падхопілі усімі цэхамі. Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партколектыву і шырокай актыўнасьці рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу рад цэхаў скончыў прамфінплян першага кварталу на 6-7 дзён раней тэрміну, значна палепшыўшы якасьць прадукцыі. **Калі мэханічны цэх меў у студзені 0,9 проц. браку, то ў сакавіку брак зьменшыўся да 0,3 проц.**

Газэта стараецца ўніпкнуць галавакружэньня ад посьпехаў:

«...з пасьпяховае правядзеньне першага этапу паходу наш заводзкі друк высунут на ўсебеларускае першынства і прэміраваны гаварывым правам рапартаваць VII зьезду прафсаюзаў БССР. Але гэта не павінна нам ускружыць галаву. Другі этап павінен быць намі скончан яшчэ з большымі посьпехамі».

Асаблівай увагі заслугоўвае разгорнутая ў газэце барацьба **ЗА НОВЫЯ ТЫПЫ МАШЫН.** Яшчэ ў пачатку лютага газэта падкрэсьлівае, што ў першым квартале неабходна падрыхтаваць да выпуску новых больш удасканаленых машын. Да гэтага часу Гомсельмаш выпускае сіласарэзку «Папэк». Заводзкія арганізацыі паставілі сабе мэтай у другім квартале выпусьціць 400 штук сіласарэзак «Інтэрнацыянал» і прыступіць да выпуску «Унівэрсалкі».

Што такое «Інтэрнацыянал» і «Унівэрсалка»? «Інтэрнацыянал» гэта больш складаная і прадукцыйная сіласарэзка, якая адпавядае новым патрабаваньням саўгасаў і калгасаў. «Унівэрсалка» гэта кормаапрацоўчая машына. Звычайная сіласарэзка «Папэк» выкарыстоўваецца за год усяго 20-40 рабочых дзён. «Унівэрсалка» можа быць скарыстана на працягу цэлага году. Ёю можна перааправаць усе кармы і нават увесьці новыя, як напрыклад, азіяцкія парбложныя каючкі, сухое сьцябло кукурузы і г. д. З увядзеньнем «Унівэрсалкі» калгасы і саўгасы атрымліваюць магчымасьць прыгатаўляць камбінаваныя кармы і павышаць смакавыя якасьці кармоў. Апрача таго, «Унівэрсалка» эканоміць мэталь, саўгас ці калгас будзе мець замест некалькіх адну машыну, якая адначасова зьяўляецца і сіласарэзкай і млын-дзярцялкай і мякухадрабілкай.

«Сельмашац» зварачаецца да рабочых заводу:

«...Складаная задача стаіць перад намі—АСВОІЦЬ ПРАЦЭСЫ ВЫТВОРЧАСЬЦІ НОВЫХ ТЫПАЎ МАШЫН. Толькі ўдарнымі тэмпамі і ўзаемным падтрыманьнем выканаем гэтую задачу і калгасы атрымаюць добраякасныя машыны».

«Сельмашац» разам з заўкомам разгарнуў кампанію праверкі рэалізацыі рабочых прапаноў.

З тэй-жа бальшавіцкай упартасьцю і настойлівасьцю, з якімі змагаўся «Сельмашац» за перавыкананьне прамфінпляну першага кварталу, ён павінен **змагацца за новыя машыны «Інтэрнацыянал» і «Унівэрсалку».** Гэта будзе лепшым падарункам сацыялістычнай сельскай гаспадарцы.

***

На прыкладзе «Сельмашца» павінны вучыцца многія нашы фабрычна-заводзкія газэты. Узор яго работы павінен перанясьці ўвесь шэраг друк. Але самому «Сельмашцу» трэба зьнішчыць рад уласных недахопаў.

Па-першае, газэта выходзіць надзвычай нерэгулярна. Гэтым самым зьнижаецца эфэктыўнасьць работы газэты. «Сельмашац» павінен дабіцца рэгулярнага выходу ва што-б там ні стала.

Па-другое, газэта слаба паказвае **як і якім чынам** паасобныя брыгады і цэхі дасягаюць посьпехаў. На гэты бок неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу, бо паказ добрых узораў работы—ёсьць лепшы сродак выхаваньня мас і падцягваньня адстаючых.

Па-трэцяе, паранцае, рэдакцыі «Сельмашца» трэба зьвярнуць увагу на тэхнічнае афармленьне газэты. Яе змрочны выгляд, неахайнасьць і адсутнасьць ілюстрацый робяць ле нячытэльнай. Рабочыя Сельмашу, якія дабіліся палепшэньня якасьці машын, заслугоўваюць добра афарміленай і прыемнай для вока газэты.

«Сельмашац» мае ўсе магчымасьці для таго, каб падняцца на лепшую большую вышыню. Змагаючыся за ўдасканаленьне с.-г. машыны, змагаючыся за «Інтэ

Фашысцкая Польшча напярэдадні фінансавай катастрофы

200 млн. дэфіцыт бюджэту

ПАНІЧНЫЯ НАСТРОІ У КРАІНЕ

ВАРШАВА, 25. Сёньня пад старшынствам прэзыдэнта Масьціцкага адбылася другая нарада былых прэм'ераў. Маршал Пілсудзкі ня прыняў у ёй удзелу. Нават міністар фінансаў і міністар гандлю і прамысловасьці пе бралі ўдзелу ў гэтай разрэклямаванай нарадзе. Правал гэтай нарады, крах усякіх разьлікаў на сьвядомую барацьбу ўраду з крызісам — ня выклікае ніякага сумненьня. «Наш Пшэглёнд» піша:

«хаця парада ў асноўным нічога ня можа даць у сэнсе паляпшэньня, або палягчэньня гаспадарчага становішча, усё - ж ёй надаецца вялікае значэньне.»

Орган яўрэйскай буржуазіі мяркуе далей, што на нарадзе будуць намечаны тыя, або іншыя мерапрыемствы для ўзмацненьня аўтарытэту ўраду, або стварэньня новага ўраду, які на аснове давер'я грамадзкасьці мог - бы рэалізаваць новую ўнутраную пазыку. **Дзяржаўны бюджэт** нават, паводле антымістычных афіцыяльных даных, **скончыўся дэфіцытам у разьмеры 200 млн. злотых.** Прыкладныя падлікі бюджэтных паступленьняў у 1932 годзе, якія чакаюцца, паказваюць, што **Польшчы зноў пагражае бюджэтны дэфіцыт у 500 млн. злотых.** Звужваньне звароту гандлю (у лютым і сакавіку месяцах на 36 проц. у параўнаньні з тымі - ж месяцамі мінулага году) і ўцечка капіталаў з Польшчы, якая ўсё працягваецца, адбіліся на становішчы польскага банку. **З вялікімі труднасьцямі ў пачатку красавіка было выплачана 50 млн. злотых процантаў па замежных пазыках.** Няўдача перагавораў у Парыжы аб новай замежнай пазыцы ўзмацніла інфляцыйныя тэндэнцыі і паслужыла сыгналам да афіцыяльнага праклямаваньня «Газэтай Польскай» **новага этапу крызісу ў Польшчы.** Ня гледзячы на дракопаўскія ўмовы цэнзуры, аказалася **зусім немагчымым утаіць праяўленьне настрою няўпэўненасьці і нават панікі, выкліканых катастрафічным пагоршаньнем фінансавага і гаспадарчага становішча краіны.**

Урад прымушан быў дэманстраваць заклапочанасьць з поваду становішча, якое стварылася, і адначасова прыцягнуць новых асоб з так званых спэцыялістаў да выпрацоўкі «плянаў дзеньня». На сцэну зьяўляецца «знаток фінансавых пытаньняў» — былы прэм'ер Бартэль. Адчуваючы ўсеагульны рост незадаваленьня, урад пускае ў ход новыя манэўры. Маршал Пілсудзкі прымушан быў перарваць свой водпуск і лячэньне ў Эгіпце і вярнуцца ў Польшчу для таго, каб у пэўнай меры санкцыянаваць «ратавальны плян польскага фашызму». Пры гэтым **нават афіцыяльныя колы ня могуць утаіць сваёй бездапаможнасьці ў вышуканьні сродкаў для папярэджаньня фінансавай катастрофы.**

Старшыня ўрадавага блёку — палкоўнік Славэк у дэклярацыі 1 красавіка абмежаваўся толькі тым, што прадракаў нямінучасьць «усё новых і ўсё больш цяжкіх ахвяр». Гэтыя ахвяры, па думцы Славэка, павінны несьці ўсе пласты грамадзтва», **гэта азначае курс на зьнішчэньне рэшткаў сацыяльнага законадаўства, на ўрэзку галодных ставак зарплаты.**

БЕСПРАЦОЎНЫЯ АТАКУЮЦЬ ПАЛІЦЭЙСКІ ВУЧАСТАК

Крывавыя падзеі ў Жырардаве

ВАРШАВА, 26. Амаль штодзенна паступаюць паведамленьні аб бурных выступленьнях беспрацоўных, якія адбываюцца ў розных гарадох Польшчы. **У Жырардаве большасьць рабочых хранічна беспрацоўныя.** Буйныя прадпрыемствы жырардаўскай мануфактуры ўжо на працягу некалькіх год амаль што бязьдзейнічаюць. Рабочыя выкінуты на вуліцу і пазбаўлены ўсякай магчымасьці заработку. Жырардаўскія беспрацоўныя ўжо даўно пазбаўлены права на мізэрную так званую ўрадавую дапамогу. У апошні час даведзеныя да роспачы беспрацоўныя амаль штодзенна зьбіраюцца ля магістрата і мясцовага дабрачыннага камітэту, патрабуючы хлеба і працы.

25-га перад магістратам сабраліся тысячы дэманстрантаў. Паліцыя ня здолела разагнаць дэманстрантаў. Нават выкліканы ваенны атрад сустрэў супраціўленьне. У сутычцы 26 беспрацоўных былі паранены. Паліцыя прабавала арыштаваць найбольш актыўных дэманстрантаў. Аднак, арыштаваныя 10 чалавек былі адбіты ад паліцэйскага канвою, які іх суправаджаў. **Пасьля гэтага натоўп беспрацоўных атакаваў паліцэйскі вучастак, прабуючы вызваліць іншых арыштаваных таварышоў.** Тут аднак моцныя паліцэйскія атрады, ўзброеныя гранатамі і сьлёзатачывымі газамі, адбілі напад беспрацоўных, разагналі, шмат з іх зьбілі і пакалечылі. У горадзе панае вялізарнае абурэньне сярод рабочых. Узмоцненыя паліцэйскія патрулі разьяжджаюць па Жырардаву, устаная ўляючы парадак. (ТАСС).

Разгон вашынгтонскай паліцыяй антывоеннай дэманстрацыі перад будынкам японскага пасольства.

Два сьмяротныя прысуды ў Львове.

ВАРШАВА, 27. Палявы суд у гор. Львове прыгаварыў да пакараньня сьмерцю **І. Трубача і Міхася Чэховіча** пад прадлогам, які ўсё часьцей выкарыстоўваецца ў адносінах да рэвалюцыйных рабочых, «абвінавачаньня ў шпіянажы». (ТАСС)

Зволены служачы забівае дырэктара фабрыкі

ВАРШАВА, 27. Учора ў 12 гадзін дня, у цэнтры Варшавы, на вуліцы Мазавецкай забіты стрэлам з рэвальвэру галоўны дырэктар Жырардоўскіх тэкстыльных фабрык Келер-Бадэн. У страляючым апазнаны нядаўна зволены былы служачы дырэкцыі Жырардаўскіх фабрык.

Амэрыканскія рабочыя вітаюць СССР

Старшынёй ЦВК СССР тав. **Калініным** атрымана з Філядэльфіі (ПАША) тэлеграма наступнага зьместу:

«Рускае таварыства ўзаемадапамогі ў Амэрыцы ад імя членаў таварыства шле да дня пралетарскага сьвята першага мая гарачае прывітаньне пралетарскай бацькаўшчыне — СССР, яго выканаўчаму органу—Савету Народных Камісараў, яго вернай абароне —рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і яго актыўнаму кіраўніку—УсеКП(б). Мы ганарымся дасягненьнямі СССР і вітаем другую пяцігодку, якая палепшыць быт рабочых і сялян.

У дзень пралетарскага сьвята 1 мая мы клянемся абараняць усімі мерамі нашу сацыялістычную бацькаўшчыну ад замахаў сусьветнага імпэрыялізму, які імкнецца пашкодзіць мірнаму будаўніцтву СССР.

Няхай жыве першае мая! Няхай жыве пралетарская бацькаўшчына — СССР! Няхай жыве пралетарская салідарнасьць!»

НА ПЕРШАМАЙСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦІ Ў СССР

Дэлегацыя францускіх рабочых едзе ў Маскву

ПАРЫЖ, 26. Паводле паведамленьня «Юманіто», на першамайскія сьвяты ў Маскву накіравалася дэлегацыя францускіх рабочых у складзе 20 чал. Апрача таго да дэлегацыі далучыліся 4 чыгуначнікі з Эльзас - Лётарынгіі. У склад дэлегацыі ўвайшлі: 2 гарнякі, 2 чыгуначнікі, 2 докеры (партовыя рабочыя), 6 мэталістаў, 3 рабочых электразаводаў, 2 хэмічных рабочых, 2 тэкстыльшчыкі і 1 будаўнічы рабочы, рабочыя мэталісты буйнейшых францускіх заводаў як Сітроен, «Альстом Дзелаж» і г. д. З удзельнікаў дэлегацыі 9 чалавек зьяўляюцца членамі ўнітарнай (рэвалюцыйнай, канфэдэрацыі працы, 2 — рэфармісцкай генэральнай канфэдэрацыі працы, 4 аўтапомных прафсаюзаў і 4 неарганізаваныя рабочыя, г. зн. не зьяўляюцца членамі прафсаюзаў. Толькі 5 дэлегатаў зьяўляюцца членамі кампартыі, рэштка беспартыйныя. Неабходныя на паездку грашовыя сродкі сабраны шляхам збораў на ўсіх буйных заводах.

***

БЭРЛІН, 27. Сёньня вечарам з Бэрліну ў Савецкі Саюз выяжджае дэлегацыя германскіх рабочых у **складзе 80 чал.** Разам з імі едуць 9 аўстрыйскіх, 20 францускіх і 20 амэрыканскіх рабочых. Большасьць германскіх дэлегатаў **беспартыйныя.** Сярод дэлегатаў таксама некалькі сацыял - дэмакратычных і некалькі камуністычных рабочых

***

БЭРЛІН, 27. Мітынг, які адбыўся ўчора і быў прысьвечан провадам дэлегацый германскіх і аўстрыйскіх рабочых, што адпраўляюцца ў Савецкі Саюз, выліўся ў вялікую дэманстрацыю бэрлінскіх рабочых у абарону Савецкага Саюзу. Вялізарны плякат з надпісам «Савецкі Саюз — ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту» быў працягнут над месцам, занятым дэлегатамі. Па даручэньні дэлегацый выступіў з прамовай член германскай дэлегацыі і старшыня мясцовага камітэту служачых Хэмніцкага электразаводу. Ён заявіў, што зьяўляючыся членам сацыял - дэмакратычнай партыі ён едзе ў СССР, ня гледзячы на тэрор адміністрацыі заводу, якая адмовіла яму ў водпуску. Ён абяцаў даць сваім таварышом праўдзівую справаздачу аб сваёй паездзе.

Другі дэлегат — старшыня заўкому бэрлінскага муніцыпальнага прадпрыемства Бух расказаў, як рэфармісцкія прафсаюзныя лідэры закідалі яго цэлымі кіпамі антысавецкіх брашур з тым, каб загадзя настроіць яго супроць краіны пралетарскай дыктатуры і ўпушыць яму неабходнасьць варожай справаздачы аб яго пагляданьнях у Савецкім Саюзе.

Чырвоныя фізкультурнікі Саксоніі едуць у СССР

МАСКВА. На першамайскае сьвята ў СССР прыяжджае дэлегацыя чырвоных фізкультурнікаў Саксоніі.

29 красавіка дэлегацыя прыбывае ў Маскву і ў гэты-ж дзень выяжджае ў Ленінград. Дэлегацыя разам з ленінградзкімі фізкультурнікамі падвядзе вынікі заключанаму год таму назад дагавору па сацспаборніцтве, які прадугледжваў рад узаемных абавязацельстваў. Фізкультурнікі Саксоніі прымуць удзел у першамайскіх ура чыстасьцях у Ленінградзе.

Ангельскія рабочыя— на дарозе ў СССР

ЛЁНДАН, 27. Учора выехала з Лёндану дэлегацыя з 20 ангельскіх рабочых (чыгуначнікаў, докераў, гарнякоў і інш.) для ўдзелу на першамайскім сьвяце ў Маскве. Праважала дэлегацыю звыш 1000 чал. Дэлегацыя вязе з сабой прывітальныя лісты ад ангельскіх рабочых, якія віншуюць пралетараў СССР з бліскучымі дасягненьнямі і клянуцца салідарна выступіць у барацьбе супроць нападу імпэрыялістаў на СССР.

***

ВЕНА, 27. Учора ў Савецкі Саюз выехала **аўстрыйская рабочая дэлегацыя** ў складзе двух камуністычных і сацыял - дэмакратычных рабочых для ўдзелу ў сьвяткаваньні 1 мая.

„Ротэ фанэ" аб рэзультатах выбараў у ляндтаг

БЭРЛІН, 26. Адносна вынікаў выбараў у ляндтаг **«Ротэ Фанэ»** піша: «кампартыя сабрала ў Прусіі на 380 тыс. галасоў больш, чым у другім туры прэзыдэнцкіх выбараў. Аднак, яна страціла параўнаўча з першым турам прэзыдэнцкіх выбараў і выбарамі ў рэйхстаг. Частка страт тлумачыцца адносна меншым удзелам рабочых у выбарах параўнаўча з буржуазнымі пластамі. Прычыны страты другой часткі часткова манэўр, які ўдаўся буржуазіі і сацыял-дэмакратам, нездавальняючае правядзеньне барацьбы супроць скарачэньня зарплаты і іншых масавых выступленьняў, сур'ёзныя прабелы ў рабоце на прадпрыемствах і апазыцыйнай рабоце ў прафсаюзах, а таксама невыстарчальнае выкананьне пастаноў Цэнтральнага Камітэту кампартыі.

Да гэтага трэба дадаць пячуваныя абмежаваньні выбарчай агітацыі КПГ, забарона яе лістовак, плякатаў і друку, забарона камуністычных дэманстрацый. Вынік выбараў вучыць партыю таму, каб палепшыць нашу ідэалёгічную масавую барацьбу, нашу баявую палітыку, накіраваную супроць нацыянал-сацыялістаў, пры адначасовым абвастрэньні нашай прынцыповай барацьбы супроць сацыял-дэмакратыі і іх філіялы — партыі Зейдэвіца.

Мы павінны ва ўсёй нашай партыйнай рабоце аддаваць больш увагі рабочай моладзі, якая часткова падаецца на вудачку гітлераўскага фашызму.

Аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва, дзяржаўных даходаў з агрэмаджанага сэктару і тавараавароту ў першым квартале 1932 г.

Пастанова ЦК КП(б)Б

Адзначыць, што заданьне першага кварталу па пляне мабілізацыі сродкаў насельніцтва выканана на 103,2 проц., па дзяржаўных даходах з агрэмаджанага сэктару — на 108,9 проц. і плян тавараавароту — на 91,2 проц.

Побач з ударнай работай і перавыкананьнем пляну мабілізацыі сродкаў па радзе гарадоў і раёнаў, шасобныя раёны дапусьцілі значнае недавыкананьне пляну.

Пры агульным перавыкананьні пляну па даходах з агрэмаджанага сэктару ў шасобных раёнах (Рагачоўскі, Кармянскі, Сеньненскі, Асіпавіцкі і інш.) назіраецца недастаткова работы і яўны срыў пляну на гэтым вучастку, а з боку шасобных прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый (ельскі прамкомбінат, барысаўскі прамсаюз і гомельскі камбінат «Спартак») маюць месца недапушчальныя факты ўтойваньня звароту і даходаў ад абкладаньня і затрыманьня за ўласным звароце належных да выплаты ў бюджэт працовых сродкаў.

У галіне тавараавароту ўсё яшчэ назіраецца перавышэньне пляновых лімітаў на таварных астачах, выпадкі замарожваньня таваравароту і зусім недапушчальнага розгортваньня мясцовых зататовак і арганізацыі саўгаспнага і калгаснага гандлю.

У мэтах забесьпячэньня спаўчасовага і поўнага выкананьня фінансавага пляну ў другім квартале, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць РК і фракцыі РВК Полацкага, Горацкага, Гарадоцкага, Нараўлянскага, Брагінскага, Шклоўскага, Капыльскага, Пятрыкоўскага, Кармянскага, Ельскага, Жлобінскага, Чачэрскага, Вушацкага, Крычаўскага, Бялыничскага, Уваравіцкага, Веткаўскага, Бярэзінскага, Клімавіцкага, Лельчыцкага, Вягомльскага, Расонскага, Асьвейскага, Бешанковіцкага і Стара-Дарожскага рабіць пасадкавае абмеркаваньне пашыпчаных у першым квартале прарываў і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну другога кварталу.

2. Рэкамэндаваць ГК, РК, фракцыі ЦСПСБ, ЦК саюзаў і райпрафсаветам разгарнуць масавую работу ў другім квартале пад выгуцтымі перадавымі гаслямі і раённымі лозунгамі: а) мікраённага сацыялістычнага спаборніцтва партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафэсіянальных арганізацый і мясцовага друку на лепшае выкананьне фінансавага пляну, б) датэрміновага выкананьня квартальнага пляну да 15 чэрвеня і в) выкананьня 50 проц. квартальнага пляну да дня 1 мая.

3. Для аператыўнага кіраваньня ўсёй аператыўна-масавай работай па мікраённым спаборніцтве, арганізаваць пры ГК і РК аператыўныя штабы пад старшынствам загадчыкаў агіт.-масавых аддзелаў ГК і РК з удзелам представіцеляў камсамольскіх, прафэсіянальных арганізацый, фінансавых органаў і друку.

4. ЦК ЛКСМБ правесьці ў другім квартале спэцыяльны камсамольскі паход за выкананьне пляну добраахвотных плацяжоў, узяўшы на сябе канкрэтныя абавязкі па выкананьні пляну другога кварталу, выходзячы з агульнага пляну добраахвотных плацяжоў.

Даручыць ЦК ЛКСМБ у першай палове мая склікаць усебеларускі зьлёт камсамольцаў і піянэраў — ударнікаў фінансавага фронту з напярэдніем прадпрыемнем адзначаных зьлётаў на раёнах.

5. У мэтах мабілізацыі калгасных мас вёскі задачы выкананьня фінансавага пляну і ўмацаваньня фінансавай гаспадаркі калгасаў, Народнаму Камісарыяту Фінансаў сумесна з Белкалгаспцэнтрам арганізаваць у кампаніі красавіка правядзеньне па калгасах, сельсаветах і раёнах зьлётаў фінансавага актыву з калгаснікаў і калгаснікаў.

6. Лічыць неабходным у пяцідзённы тэрмін склікаць пры ЦК парадку кіраўнікоў цэнтральных гаспадарчых арганізацый, фінансава-крэдытных устаноў і прадпрыемстваў — ЦКК-РСІ і прамадзкіх арганізацый па пытаньні выкананьня дырэктыў партыі аб поўным і спаўчасным выкананьні прадпрыемствамі агрэмаджанага сэктару сваіх плацежных абавязкаў перад дзяржавай.

7. Даручыць ГК, РК і КК-РСІ правесьці рашучую барацьбу з выпадкамі ўтойваньня ад абкладаньня звароту і даходаў шасобнымі прадпрыемствамі агрэмаджанага сэктару, як з праяўленьнем пэпманскага духу і месьніцкіх тэндэнцый, а асоб, вінаватых у гэтым, прыцягваць да суровай адказнасьці.

8. Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і мясцовых газэт праз друк маблізаваць масы на поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну другога кварталу, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкананьне фінансавага пляну па агрэмаджаным сэктары.

9. Пастанову апублікаваць у друку.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Штодзенна выходзяць з канвэеру па 100 трактараў

ХАРКАЎ, 27 красавіка. Упяршыню з канвэеру Харкаўскага трактарнага заводу імя Арджанікідзэ 25 - 26 красавіка зьнята па 100 трактараў. Такім чынам завод па - ўдарнаму датэрмінова выканаў свае абавязацельствы — дабіцца да 1-га мая выпуску 100 трактараў штодзенна.

Выкананьне прамфінпляну цяжкай прамысловасьці за 20 дзён красавіка

Паводле вестак Наркамату цяжкай прамысловасьці, прадпрыемствы Наркамату выканалі месячны плян за 20 дзён на 54,8 проц. Выпушчана прадукцыі на суму 3.970.000 руб. Завод Гомсельмаш выканаў плян на 63,3 проц., «Чырвоны мэталіст» на 33,2 проц. Усяго па заводах **сельгасмашынабудаўніцтва** месячны плян за 20 дзён выканан на 54,1 проц.

Завод імя Варашылава выканаў праграму на 21,2 проц., завод «Пралетары» — 43,4 проц., завод «Камунар» — 34,8 проц., завод імя Сталіна — 34,4 проц. і «Чырвоны адраджэнец» — 69,2 проц. Усяго на заводах **машынабудаўніцтва** месячны плян за 20 дзён выканаць на 34,9 проц.

Рамонтны завод «Рухавік рэвалюцыі» выканаў праграму на 75,5 проц.

Завод «Чырвоны кастрычнік» выканаў плян на 42,4 проц., завод «Інтэрнацыянал» — 42 проц. і завод «Ударнік» — 9 проц. Усяго па дробнай мэталюргічнай прамысловасьці месячны плян за 20 дзён выканан на 33,5 проц.

Акулярная фабрыка выканала праграму на 77 проц. Крычаўскі фасфарытны завод выканаў плян на 29,4 проц.

Цагельня № 1 выканала плян на 12,8 проц., цагельня № 8 — на 41,1 проц. Усяго па цагельнях плян выканан на 14,8 проц. Ваннаны завод выканаў плян на 8,6 проц. Кахляна - плітачны завод — на 66,9 проц. і завод блёчнага каменьня — на 18,4 проц.

Усяго па будматар'ялах месячны плян за 20 дзён выканан на 28 проц.

Сельгасмашыны

Завод **Гомсельмаш** за 24 красавіка выпусьціў 21 сіласарэзку «Папэк», або 70 проц. пляну, 17 сячкарань — 106 проц., 6 бульбамыек — 70 проц., 20 бульбасартовак — 143 проц., і 4 капюшыпасартоўкі — 118 проц.

25 красавіка выпушчана 36 сіласарэзак «Папэк», — 120 проц., 17 сячкарань — 106 проц., 8 бульбамыек— 93 проц. і 20 бульбасартовак — 143 проц.

***

Завод **«Чырвоны мэталіст»** за 23 красавіка выпусьціў 26 жмыхадрабілак, што складае 165,2 проц. пляну, 30 карнярэзак—150 проц., 35 бульба капалак — 116,7 проц. і 6 боран «Зіг-заг» — 11,5 проц. Усяго дзённае заданьне выканана на 118,8 проц.

На 1-й БелДРЭС

1-ая БелДРЭС за 23 красавіка выпрацавала 161.000 кілёват гадзін. Максымум дасягнуў 8.600 кілёват, мінімум — 6.000 кілёват і сярэдняе— 6.700 кілёват. За 24 красавіка выпрацавана 149.000 кілёват - гадзін. Максымум дасягнуў 7.500 кілёват, мінімум 5.400 кілёват і сярэдняе — 6.200



НА ЗДЫМКУ: Агульны выгляд камбінату на Кузьнецкабудзе.

Будматар'ялы

Лесазавод імя Халтурына за 23 красавіка распілаваў 270,3 кбм. сырцу, што складае 124,5 проц. пляну.

***

Лесакамбінат «Камінтэрн» за 23 красавіка распілаваў 217,6 кбм. сырцу, або 105,7 проц. Фанэры выпушчана 48,6 к. м., што складае 90,6 проц. пляну.

За 25 красавіка распілавана 219,9 к. м, або 116,5 проц., фанэры выпушчана 63,1 к. м., або 127,7 проц. заданьня.

Папера

Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» за 24 красавіка выпусьціла 59,3 тоны паперы, што складае 73,4 проц., саломы - цэлюлёзы выпушчана 8 тон, або 67 проц.

Расклад радыёлекцый на май 1932 г. Інстытуту масавага завочнага навучаньня партактыву (БІМЗО) пры ЦК КП(б)Б

Лекцыі перадаюцца: раніцою ад 8 да 9 гадз. і вечарам ад 19 г. 15 м. да 20 г. 15 м. праз Менскую радыёстанцыю імя Саўнаркому Беларусі РВ—10 хваля 1117,3 мэтры.

Вучэбныя лекцыі, прачытаныя вечарам, будуць паўтарацца на наступны дзень раніцою.

Аб зьменах у раскладзе кожны раз пасьля перадачы лекцыі будзе дадаткова паведамляцца. (Выходныя дні, у якія ня будзе перадач: 3, 8, 13, 18, 23 і 28).

I. Для завочнага камвузу.

6-V—Гісторыя клясавай барацьбы на тэму: «Эпоха імпэрыялізму» (паўтараецца 7-V раніцой).

12-V—Лекцыя-кансультацыя на тэму: «Дадатковая вартасьць» (паўтараецца раніцою 14-V).

17-V—«Фізычная і палітычная карта сьвету» (паўтараецца 19-V раніцой).

24-V—Уводная лекцыя па палітэканоміі на тэму: «Заработная плата» (паўтараецца 25-V раніцой).

II. Для саўпартшкол і камсамольскага ўнівэрсытэту.

2-V—Кансультацыя па палітэканоміі на тэму: «Вартасьць».

9-V—Уводная лекцыя па палітэканоміі на тэму: «Тропы» (паўтараецца 10-V раніцой).

16-V—Лекцыя-кансультацыя па палітэканоміі на тэму: «Дадатковая вартасьць».

30-V—Уводная лекцыя па палітэканоміі на тэму: «Заработная плата і ўсеагульны закон капіталістычнага накапленьня».

III. Для радыё-курсаў партактыву.

7-V—«Ленінская тэорыя імпэрыялізму» (паўтараецца 9-V раніцой).

10-V—Уводная лекцыя да тэмы: «Усеагульны крызіс капіталізму і задачы Камінтэрну» (паўтараецца 11-V раніцой).

14-V—Лекцыя-кансультацыя па тэме: «Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі».

15-V—«Абагульваньне вопыту партыйна-масавай работы на прадпрыемствах».

20-V—Уводная лекцыя на тэму: «Рэканструкцыя гарадзкой гаспадаркі».

21-V—«Задачы арганізацыйна - партыйнай работы на даным этапе» (паўтараецца 22-V раніцой).

25-V—«Палітыка зарплаты і задачы прафсаюзаў у разрэзе IX Усесаюзнага прафзьезду» (паўтараецца 26-V раніцой).

27-V—«Партыйнае кіраўніцтва камсамолам».

29-V—Лекцыя на тэму: «Гаспадарчы разрахунак на даным этапе і задачы партыйных арганізацый».

IV. Для ўсіх відаў завочнага партыйнага навучаньня: камвузаў, СПШ, радыё-курсаў, камсамольскага ўнівэрсытэту, шырокага партыйна-камсамольскага актыву.

1-V—«Міжнароднае становішча і задачы працоўных СССР».

4-V—«Барацьба за партыйнасьць у гістарычнай навуцы».

5-V — «Гістарычнае падрыхтаваньне бальшавізму».

11-V—Лекцыя на тэму: «Задачы партыі ў галіне мастацтва і літаратуры».

19-V—Інструкцыйны даклад і мэтадычныя ўказаньні да праграмы чарговых тэм для ўсіх відаў партнавучаньня (паўтараецца 20-V раніцой).

22-V—Лекцыя на тэму: «Асновы тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы».

26-V—«Марксыцка-ленінскае вучэньне аб дзяржаве і дыктатуры пралетарыяту» (паўтараецца 27-V раніцой).

31-V—Лекцыя на тэму: «Спэцыялізацыя сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і вырашэньне праблемы тэхкультур».

V. Лекцыі, якія будуць перадавацца раніцой.

1-V—«Савецкі гандаль на вёсцы».

2-V—Лекцыя на тэму: «Аб сацыяльнай прыродзе калгасаў».

4-V—«Асноўныя рысы капіталістычнага спосабу вытворчасьці».

6-V—«Аб ходзе веснавой сяўбы і задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў».

6-V—«Арганізацыя працы ў калгасах у 1932 г. і задачы партыйных і камсамольскіх арганізацый».

12-V—«Праблемы другой пяцігодкі ў сьвятле вучэньня Маркса, Леніна і Сталіна».

15-V—«Фінансавая палітыка Савецкага саюзу і задача савецкага гандлю».

16-V—«Тэхнічная рэканструкцыя чыгуначнага транспарту».

17-V—«Грамадзкае харчаваньне і задачы паляпшэньня дабрабыту працоўных».

21-V—«Нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў БССР».

29-V—Задачы электрыфікацыі.

30-V—Вынікі набору ў сыстэму завочнага навучаньня і чарговыя задачы партыйных і камсамольскіх арганізацый.

31-V—Інструкцыйны даклад райпартарганізатараў аб чарговых задачах марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў і кандыдатаў партыі.

Дырэктар БІМЗО пры ЦК КП(б)Б
ЗАЛАТУХІН.

Паведамленьні

— Чарговыя зайняткі курсаў партактыву адбудуцца: 3-га мая для дырэктароў, 5-га мая—старшыні ФЗК, 8-га мая —сакратароў парт'ячэек,—у памяшканьні Дому Камасьмолы, пакой № 23, пачатак у 10 гадз. раніцы.

Яўка абавязкова без спазьненьня.

— 29-IV, у 6 гадз. веч., у памяшканьні БАН (рог Лекінскай і Унівэрсытэцкай, вялікая заля) культпроп ЦК КП(б)Б скліча нараду, на якую павінны абавязкова зьявіцца рэктары, заг. навуковай часткі інстытутаў, выкладчыкі грамадзка-палітычных дысцыплін ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў гор. Менску, а таксама сакратары парт. і камсамольскіх ячэек ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў і загадчыкі аддзелаў кадраў Наркаматаў, якія маюць інстытуты і тэхнікумы. Парадак дня: абсьледваньне марксыцка-ленінскага выкладаньня ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ
выходзіць з друку і рассылаецца падпісчыкам
НОВАЯ ЧАСОПІСЬ КНІЖНАЙ І БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ.
КРЫТЫКІ, БІБЛІЯГРАФІІ І ПРАПАГАНДЫ КНІГІ
„КНІГА—МАСАМ"
№ 1 (красавік 1932 г.)
ЗЬМЕСТ:
1. Да нашых чытачоў.
2. Ал. Некрэшэвіч.—З трэцяга рашаючага у чакьверты завяршальны (аб рабоце ДВБ).
I. Сельска-гаспадарчая кніга.
3. Супроцькандранцьеўшчыны і нацдэма крацызму ў пытаньнях сельгасвароту (агляд (літаратуры)—Г. І Р.
4. Арлоўскі.—Ня складаць кармовыя рацыёны для малочных кароў" і „Арганізацыя групавога кармленьня ў сац. гаспадарках" (рэцэнзія) — тав. Малочна.
5. Лебядзевіч.—„Культурныя пашы на асушаных балотах" (рэцэнзія). — Р. Пінуліч.
II. Вайсковая кніга.
6. Максіменка.—„Памятка байцу стрэлку аб конніцы" (рэцэнзія)—П. В.
7. Шапіра.—„Шрубачкі" (2 рэцэнзіі)—Вільнгбрыкі і Ажгірэй.
III. За маркыцка-ленінскі падручнік.
8. Вальфсон—Гак. „Нарысы гістарычнага матэрыялізму" (рэцэнзія) — М. Канстатынаў.
IV. У рабочых рэдакцыйных саветах ДВБ.
V. Перагляда з аўтарамі.
VI. Да дваццацігодзьдзя творчай працы А. Александровіча (сьпіс літаратуры).
VII. Хроніка (выдавецкая і бібліятэчная.).
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: да канца году—2 р. 70 к., на 1 месяц—30 кап.
КОШТ АСОБНАГА НУМАРУ 30 кап.
Падпіска прымаецца ўсімі гарбюро і райбюро Саюздруку, паштовымі агенцтвамі сувязі і лістаносцамі.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — МАСТАЦКІ САВЕЦКІ ФІЛЬМ ЧОРНАЯ СКУРА драма ў 6 част. кіно-хроніка „За Сав. Беларусь".
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Мастацкі фільм вытворч. УСХОДКІНО ІГДЭНБУ
ПРАЛЕТАРЫ — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ Здань, якая не зьвяртаецца Драма ў 8 частках.
СПАРТАК Пачатак: 7 г., 8-15, 9-30, 10-45 — Замежны фільм ПАЧНЫ КРЫК Зыш праграмы Навука і тэхніка ч. 1

МЕНЦЭРАБКОП паведамляе ўсіх зацікаўленых асоб і ўстаноў, што З ПРЫЧЫНЫ ПЕРАДАЧЫ ПЛОДАГАРОДНАЙ базы МЦРК ПЛОДАГАРОДНАМУ ТРЭСТУ пры Белкавплодагародніне. УСЕ ПРЭТЭНЗІІ — будуць прымацца — тольки да 3 мая 1932 г. непасрэдна базай МЦРК па адрасе: вул. Розы Люксэмбург, база МЦРК.
Менцэрабкоп.

У ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ— — узмацнім матар'яльную дапамогу палітзьняволеным. —
Менскі Гарадзкі Камітэт МОПР'у праводзіць 30-га красавіка, 1-га і 2-га мая
СКАРБОНАЧНЫ ЗБОР
на нарысьць палітзьняволеных і іх сем'яў.
Усе вылучаныя мопраўскіні ячэйкамі для ўдзелу ў скарбоначным збору павінны зьявіцца ў ГК МОПР'у (Савецкая 87, 2-гі паверх) 30-га красавіка, у 4 гадз. дня.
У 5 гадз. адбудзецца дэманстрацыя ўдзельнікаў скарбоначнага збору.
Таварышы, вылучаныя ад ячэек, павінны мець на руках пуцёўкі.
Мен. ГК МОПР'у.

МЕНСКІ БЕЛАРУСКІ ПЭДАГАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ
АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ на 3-мясочныя падрыхтоўчыя курсы (для падрыхтоўкі паступаючых у пэдтэхнікум).
Заявы прымаюцца да 10-га мая. Пачатак заняткаў 15-га мая.
Прымаюцца асобы, якія скончылі ня менш 5 груп 7-мігодкі або адпаведнай навучальнай установы.
Да заявы прыкладаецца дакумант аб сацыяльным становішчы, анкету пасьведчаную, матрыцную справаку.
Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам, і больш бедным стыпендыяй.
Заявы адрасаваць: Менск, Савецкая 107, Белпэдтэхнікум.

З 1 па 15 мая абвяшчаецца рэгістрацыя ўсіх кіно-ўстановак
як стацыянарнага, так і перасовачнага тыпу.
Усе арганізацыі, у якіх ёсьць апаратура, павінны атрымаць бланкі рэгістрацыі ў аддзяленьнях БДК (Менск, Вабруйск, Ворша, Віцебск, Гомель) і прадставіць іх туды да 15-V-32 г.
Усе кіно-ўстаноўкі, якія да 15 мая ня будуць узяты на вучот, забясьпечваецца карцінамі ня будуць.
Рэгістрацыі падлягаюць усе кіно-ўстаноўкі якія дзейнічаюць, а таксама і тыя, якія бязьдзейнічаюць.
Белдзяржкіно.

ПАБУДОВЕ ПАСЁЛКУ на 160 кватэр па Грушэўскай вуліцы патрабуюцца ЦЕСЬЛЯРЫ і чорнарабочыя для работы на працягу ўсяго будаўнічага сэзону. Рабочыя забясьпечваюцца інтэрнатам на месцы работ. Зварачэнцца: г. Менск, Грушаўская, пабудова 160 кварт. пасёлку.

Пры Менскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме (былы палітэхнікум) АДКРЫВАЮЦЦА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ Ў ТЭХНІКУМ
Для рабочых (без адрыву ад вытворчасьці).
Курсы разьлічаны на 4 месяцы.
На курсы прымаюцца рабочыя непасрэдна з вытворчасьці, якія маюць ня менш 2-гадовага рабочага стажу і адукацыю ня ніжэй 5 клясаў семігодкі.
Па скончэньні курсаў слухачы залічваюцца ў архітэктурна будаўнічы т